Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 182 (5856) | 9 жніўня 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Усебеларуская нарада старшынь калгасаў. Спрэчкі па дакладу члена ЦК ВКП(б) загадчыка Сельскагаспадарчым аддзелам ЦК ВКП(б) тав. Я. А. Якаўлева.

Дэлегаты ўсебеларускай нарады старшынь калгасаў растлумачваюць калгаснікам гістарычную пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Зводка Наркамзема БССР аб ходзе ўборкі каласавых і ільну на 5 жніўня 1937 г.

АРТЫКУЛЫ:

Перадавы — Узорна правесці сяўбу азімых.

Н. Стэрнін — Дзіўная «забыўчывасць».

Трацэўскі — Да канца выкарчуем шпіёнаў і дыверсантаў.

Кучынскі — Своечасова і без страт ўбярэм багаты ўраджай.

Баскскія футбалісты прыехалі ў Менск.

— Спектакль МХАТ у Парыжы.

ЗА РУБЯЖОМ:

— Адказы 37 краін па заяву Хэла. — Да палёту на совецкае генеральнае консульства ў Цяньцзіне. — На франтах у Іспаніі. — Хваляванні ў тарнізоне мяцежнікаў. — Цікавыя паказанні германскага матроса. — Уздым антыяпонскага руху ў Кітаі. — Прыгарады Бэйпіна перапоўнены партызанскімі атрадамі.

УЗОРНА ПРАВЕСЦІ СЯЎБУ АЗІМЫХ

«Банда шпіёнаў і шкоднікаў,—гаворыцца ў пісьме да таварыша Сталіна і таварыша Молатава, прынятым на ўсебеларускай нарадзе старшынь калгасаў,—якая прабралася на кіруючыя пасты Беларусі, уключала ў план сяўбы неіснуючыя плошчы зямлі, каб прымусіць калгасы сеяць жыта па жыту, лён не па канюшыне, азімыя не па папару і гэтым самым знізіць ураджай на палях Беларусі».

Совет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) у сваёй пастанове «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання» ў парадку ліквідацыі вынікаў шкодніцтва скарацілі пасеўнае заданне на 1938 год па калгасах БССР на 300 тыс. гектараў, «абавязаўшы НКЗ СССР, СНК БССР і ЦК КП(б)Б устанавіць у гадавы тэрмін правільныя севазвароты па калгасах БССР і забяспечыць пераход усіх калгасаў не пазней трохгадовага тэрміна да пасеваў строга ў адпаведнасці з устаноўленымі севазваротамі».

Учора «Звязда» апублікавала пастанову СНК БССР аб дзяржаўным плане азімай сяўбы на 1937 год. У гэтай пастанове ў параўнанні з мінулым годам прадугледжваецца змяншэнне плана азімай сяўбы на 181.000 гектараў. Усяго, такім чынам, соўгасы, калгасы і аднаасобныя гаспадаркі БССР павінны цяпер, у гэту восень, пасеяць 945,1 тыс. гектараў, у тым ліку 91,4 тыс. гектараў азімай пшаніцы.

Гэта дапамога беларускаму народу з боку партыі і саюзнага ўрада, аказаная па ініцыятыве таварыша Сталіна, да многага абавязвае калгаснае сялянства Беларусі. Створаны выключна спрыяючыя ўмовы для заваявання высокіх ураджаяў. І калгаснае сялянства Беларусі абавязана дабіцца іх ва што-б там ні стала.

Добрая падрыхтоўка глебы і ачыстка насення, поўнае выкарыстанне гатунковага насення, выкананне ўсіх прэвіл агратэхнікі і спіслыя тэрміны сяўбы — важнейшыя ўмовы барацьбы за высокі ўраджай.

Пакуль што рэспубліка непярпіма слаба выхтуецца да сяўбы азімых. Асабліва пагражаючае становішча з падрыхтоўкай глебы. План уздыму папараў па рэспубліцы не выкананы, паднятыя папары апрацоўваюцца вельмі марудна.

Вядома, што буйнейшае значэнне набываюць тэрміны апрацоўкі папараў. Да пачатку сяўбы глеба павінна асесці. Між тым, двойка папараў у многіх раёнах зусім зрываецца. Дастаткова сказаць, што ўсяго па рэспубліцы падвоена 40 тыс. гектараў, што складае толькі 13,1 проц. да колькасці ўзнятых папараў. Асобныя раёны поўнасцю сарвалі падрыхтоўку глебы. У Сіроцінскім, Веткаўскім, Свяцілавіцкім, Перахоўскім, Бягомльскім, Чырвонапольскім, Бабруйскім Камарынскім і Хойніцкім раёнах двойка праведзена толькі на плошчы 1—3 проц. узнятых папараў.

Зрываецца вывазка гною і мінеральных угнаенняў. На складах Белсельгасснабжа ляжыць каля 18.000 тон мінеральных угнаенняў, якія ўжо даўно павінны былі быць выкарыстаны на калгасных палях.

Пераважная большасць калгасаў рэспублікі яшчэ не засыпала насення. У Лагойскім, Петрыкаўскім, Старадарожскім, Лельчыцкім і радзе іншых раёнаў да засыпкі насення нават не прыступілі. Ясна, што такое становішча ставіць пад пагрозу зрыву сяўбу азімых.

Рашаючае значэнне набывае якасць насенных матэрыялаў. Пастанова Соўнаркома Саюза аб мерах па паляпшэнню насення зерневых культур абавязвае «забяспечыць сяўбу толькі адборным гатунковым насеннем не менш 70 проц. усіх насенных участкаў па азімых культурах увосень 1937 года.

У гэтым годзе трэба разбыцца і ліквідаваць тую запушчанасць, якую стварылі шкоднікі ў насеннай спразе. Патрэбна навесці рашучую барацьбу за ўпарадкаванне насеннай гаспадаркі. СНК БССР зацвердзіў план сяўбы гатунковых азімых культур у калгасах у колькасці 269.213 гектараў азімага жыта і 89.600 гектараў азімай пшаніцы. Асноўная прадукцыя гатунковага насення азімага жыта — «вятка», гатунак, які апрацоўвае ў ўмовах БССР. Таксама пастановай вызначаны гатункі азімай пшаніцы.

На жаль, далёка не ва ўсіх раёнах змагаюцца за высокагатунковае насенне. У Мсціслаўскім раёне, не гледзячы на існуючую катэгарычную забарону, гатунковае збожжа выкарыстоўваюць на іншыя мэты. Так, напрыклад, калгас «Іскра» здаў Мсціслаўскаму вінбровару 25,7 цэнт. жыта гатунку «вятка». 7,3 цэнт. гатунковага жыта здаў калгас «Большэвік Мсціслаўшчыны» і т. д. Усё гэта збожжа заводам пушчана ў вытворчасць. Раённыя арганізацыі праходзяць міма гэтых абураючых фактаў. Калгасы раёна нават не забяспечаны адпаведнымі «гатункозымі пасведчаннямі». Гэта прывяло к таму, што калгасы Дудчыцкага сельсовета па тры разы вазілі гатунковае збожжа на загатоўчы пункт і не маглі яго здаць. Дрэнна ўбіраюцца і насенныя ўчасткі. У многіх калгасах гатунковае насенне змешваюць з радавым.

Аналагічныя сігналы паступаюць з Брагінскага, Барысаўскага і інш. раёнаў. З гэтымі злачынствамі трэба неадкладна пакончыць.

У кожным калгасе павінна быць абвешчана барацьба за поўнае выкарыстанне ўсяго насеннага матэрыялу з убіраемых насенных участкаў. Асаблівыя клопаты пазінны быць праяўлены да вызначэння насенных участкаў к сяўбе азімых і падрыхтоўцы пад іх глебы. Нарэшце, совецкія і зямельныя арганізацыі абавязаны хутка і чотка арганізаваць абмен гатунковага насення. Пакуль што ў большасці раёнаў к гэтаму не прыступілі. Дастаткова сказаць, што па ўсёй рэспубліцы абменена толькі 796 цэнт. Трэба ўлічыць, што абмалот ураджаю насенных участкаў супадае з тэрмінамі сяўбы, і малейшая марудна можа сарваць справу забеспячэння плошчы гатунковым насеннем.

Пасеяць як мага больш гатунковым насеннем — важнейшая задача. За гэта трэба змагацца ўсімі сіламі. Але ў гэтым годзе большасць азімага кліна яшчэ будзе абсяменена звычайным насеннем. А гэта значыць, што пазінна быць праяўлена не менш клопатаў аб высокай якасці, чыстаты і негатунковага насення.

У паспяховым правядзенні сяўбы азімых асабліва вялікая роля МТС. Неабходна так пабудаваць работу кожнай МТС, кожнай трактарнай брыгады, каб усе трактары, радавыя сеялкі працавалі бесперабойна, каб пакончыць з «непаладкамі», за якімі часта хаваецца шкодніцтва. Трэба памятаць, што радковая сяўба не толькі эканоміць насенне — што само па сабе вельмі важна, — але і павышае ўраджайнасць на 10—15 процантаў у параўнанні з ручным пасевам.

СНК БССР абавязаў райвыканкомы ў пяцідзённы тэрмін давесці план сяўбы да ўсіх калгасаў і аднаасобных гаспадарак. Трэба забяспечыць безумоўнае выкананне гэтай дырэктывы, тым больш, што часу да пачатку масавай сяўбы асталося вельмі мала. Прадзельны тэрмін завяршэння сяўбы азімых у БССР — 1 верасня. Значыць, партыйныя, совецкія арганізацыі, зямельныя органы не могуць залаволіцца фармальным спушчэннем плана. Яны абавязаны дапамагчы кожнаму калгасу правесці канкрэтныя мерапрыемствы, каб навярстаць упушчанае, каб завяршыць падрыхтоўку і разгарнуць высокаякасную сяўбу азімых.

Яшчэ ніколі калгаснікі Совецкай Беларусі не мелі такія выключна спрыяючыя ўмовы для барацьбы за высокі ўраджай чым цяпер. За апошні год калгасная вёска насыцілася тысячамі новых складаных сельскагаспадарчых машын. Калгасы атрымалі вялікую дапамогу і ільготы па хлебапастаўках і натураплаце МТС. Выраслі тысячы і дзесяткі тысяч стаханаўцаў — майстраў высокіх ураджаяў. Гістарычная пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў калгасным упарадкаванні натхняе калгасныя масы на ўзоры стаханаўскай работы, на барацьбу за канчатковае выкарчоўванне ворагаў народу — фашысцкіх шпіёнаў, за далейшыя перамогі ў барацьбе за сталінскіх 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Партыйныя і совецкія арганізацыі Беларусі павінны ўзначаліць палітычны ўздым мас, дапамагчы калгаснікам да канца выкрыць і знішчыць подлых, прэзрэнных польскіх шпіёнаў, замацаваць поспехі ўраджаю бягучага года, высокаякасна і ў спіслыя тэрміны правесці сяўбу азімых, каб у будучым годзе атрымаць высокі ўраджай.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

4 жніўня Народны Камісар Замежных Спраў М. М. Літвінаў і пасол ЗША пан Джозеф Дэвіс абмяняліся нотамі па пытанню аб гандлёвых узаемаадносінах паміж СССР і ЗША. Абмен нот прадугледжвае прымяненне безумоўнага і неабмежаванага найбольшага спрыяння да імпарту совецкіх тавараў у ЗША і да ўмоў экспарту амерыканскіх тавараў у СССР. Абмен нот уступае ў сілу з дня пракламацыі Прэзідэнта ЗША і зацвярджэння яго Саветам Народных Камісараў СССР.

Совет Народных Камісараў СССР зацвердзіў памянёны абмен нот 6 жніўня, у той жа дзень абмен нот быў пракламіраван Прэзідэнтам ЗША панам Рузвельтам. Такім чынам, абмен нот аб гандлёвых узаемаадносінах паміж СССР і ЗША уступіў у сілу з 6 жніўня 1937 года.

СПЕКТАКЛЬ МХАТ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 8 жніўня. (БЕЛТА). Першы спектакль маскоўскага ордэна Леніна Мастацкага Акадэмічнага тэатра СССР імя Горкага ў памяшканні тэатра Елісейскіх палёў прайшоў з выключным поспехам. Ішла п'еса Горкага «Вораги». Публіка, запоўніўшая вялізны тэатр, які змяшчае каля 2.000 глядачоў, з напружанай увагай сачыла за выдатнай ігрой совецкіх актораў. Пасля скончэння спектакля доўга не змаўкалі авацыі.

У спектаклі МХАТ французскага глядача здзіўляе выключнае майстэрства выканаўцаў і сапраўдны рэалізм пастаноўкі.

Здзіўляе глядача і той факт, што на гастролі ў Парыж прыбыла не група актораў, а ўвесь калектыў тэатра ў цэлым.

«Юманітэ» апублікавала артыкул Гэля, прысвечаны гастролям МХАТ. Гэль падкрэслівае выключна добрыя ўмовы, створаныя ў Совецкім Саюзе для развіцця тэатральнага мастацтва.

ДЭЛЕГАТЫ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ РАСТЛУМАЧВАЮЦЬ КАЛГАСНІКАМ ГІСТАРЫЧНУЮ ПАСТАНОВУ СНК СССР І ЦК ВКП(б)

СПРАВАЗДАЧЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ НАРАДЫ

Старшыні калгасаў Брагінскага раёна, якія прымалі ўдзел ва Ўсебеларускай нарадзе старшынь калгасаў, цяпер на агульных сходах калгаснікаў выступаюць з дакладамі, расказваюць аб той вялікай дапамозе, якая аказана партыяй і ўрадам калгаснаму сялянству Беларускай ССР. Сходы праходзяць з вялікім уздымам.

8 жніўня у раёне адбылася нарада старшынь, брыгадзіраў і жывёлаводаў калгасаў, на якой таксама былі заслуханы справаздачы ўдзельнікаў усебеларускай нарады. Выступілі тт. Шыргароцкі— старшыня калгаса імя Дзержынскага, Новікаў — калгас «Савічы», Валасенка — калгас «Чырвоны рассвет», Дзернавой— калгас імя Варашылава і іншыя. Нарада, на якой прымала ўдзел больш 200 чалавек, праходзіла з выключнай актыўнасцю. Удзельнікі нарады абавязваюцца да канца выкрыць і знішчыць ворагаў народу, падзесяцерыць сваю пільнасць, мабілізаваць усе сілы на найхутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

Дзесяткі калгаснікаў у сваіх выступленнях на мітынгах, сходах дзякуюць таварышу Сталіну за клопаты аб калгасным сялянстве.

— Факты шкодніцтва, — гаворыць у сваім выступленні калгаснік калгаса «Парыжская комуна» тав. Паддубны, — мелі месца і ў нашым калгасе. З мэтай зніжэння ўраджаю шкоднікі даводзілі няправільныя планы сяўбы. На пастанову партыі і ўрада адкажам узорамі барацьбы за высокі ўраджай, датэрміновым выкананем свае абавязкі перад дзяржавай.

ПРОТЧАНКА.

ДА КАНЦА ВЫКАРЧУЕМ ШПІЁНАЎ І ДЫВЕРСАНТАЎ

З вялікім уздымам і энтузіязмам сустрэлі калгаснікі Асіпавіцкага раёна пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб дапамозе калгаснаму сялянству Беларускай ССР. 6 жніўня ва ўсіх калгасах раёна адбыліся сходы і мітынгі, на якіх калгаснікі з вялікай радасцю абмяркоўвалі гістарычную пастанову партыі і ўрада.

На сходзе калгаса «Кастрычнік», Верайцоўскага сельсовета, выступіў удзельнік Усебеларускай нарады старшынь калгасаў тав. Нелейка Ігнат, які расказаў аб гнусных дзеяннях ворагаў народу, якія прынеслі вялікую шкоду калгаснікам Совецкай Беларусі. Тав. Нелейка, а таксама члены калгаса Злобіч Фёдар, Мікіч Яўхім, Баршчаўскі і іншыя ў сваіх выступленнях прывялі прыклады шкодніцтва ў сельгасарцелі «Кастрычнік». Большасць калгаснікаў гэтай арцелі мелі прысядзібныя ўчасткі толькі па 0,10—0,12 гектара, а пастаўкі дзяржаве здавалі з плошчы 0,30 гектара. За тое, што калгас высек некалькі цнёў дроўнага лесу для рамонту сельгасінвентару, быў накладзены штраф у суме 240 руб. У калгасе насажалася многа ферм, а жывёлагадоўля развівалася зусім слаба.

У сваіх выступленнях калгаснікі горача вітаюць мерапрыемствы партыі і ўрада па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання. Калгаснікі запэўняюць партыю і ўрад, што яны яшчэ лепш будуць працаваць на калгасных палях, каб дабіцца высокіх ураджаяў, высока падняць кошт працадня.

У рэзалюцыі яны пішуць: «Польскія шпіёны і бандыты, якія арудвалі ў Совецкай Беларусі, усімі метадамі праводзілі сваю шкодную работу. Яны хацелі вярнуць беларускаму народу пакуты, ярмо польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Але гэта подлым фашысцкім тадам не ўдалося і ніколі не ўдасца. Ворагі народу будуць выкарчаваны з корнем і знішчаны.

Мы горача вітаем мерапрыемствы партыі і ўрада аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Мы шчыра дзякуем правадыру народаў таварышу Сталіну за клопаты аб беларускім народзе, за дапамогу, якая аказана нам комуністычнай партыяй і Совецкай уладай.

У адказ на гэту гістарычную пастанову мы яшчэ больш узнімем рэволюцыйную пільнасць, да канца выкарчуем польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, хутчэй ліквідуем вынікі іх шкодніцтва.

ТРАЦЭЎСКІ.

ВЯЛІКІЯ АВАНСЫ НА ПРАЦАДЗЕНЬ

Калгас «Ударнік», Папаратняўскага сельсовета (Жлобінскі раён), выканаў план абавязкозых паставак збожжа дзяржаве ў ліку 16 тон.

Зараз ў калгасе прайшла выдача авансам хлеба і грошай на працадні. Калгаснікі атрымалі ў аванс на кожны працадзень па 1 клгр. жыта, 300 грамаў ячменю і 50 кап. грашыма.

Калгаснікі ўпэўнены, што ў гэтым годзе будзе на працадзень па 5 кілограмаў збожжа і апрача таго — многа бульбы і грошай.

П. МАСКАЛЕНКА.

58 КАЛГАСНІКАЎ АТРЫМАЛІ ПРЫСЯДЗІБНЫЯ УЧАСТКІ

Як толькі была атрымана пастанова СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання, Чашніцкі райком партыі вылучыў адказных работнікаў з райпартактыва і разаслаў па калгасах для растлумачэння гэтай гістарычнай пастановы сярод калгаснікаў. Прыняты меры, каб усіх калгаснікаў, якія не мелі мінімальнай нормы прысядзібных участкаў, надзяліць агародамі.

Ужо 58 калгасніцкіх гаспадарак па 14 сельсоветах раёна атрымалі агароды, згодна ўстаноўленай нормы.

Калгаснікі шчыра дзякуюць комуністычную партыю і совецкі ўрад і асабіста таварыша Сталіна за бацькоўскія клопаты і дапамогу калгаснаму сялянству.

Б. КАЗЛОЎ.

Працоўныя Совецкай Беларусі з захапленнем сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання. НА ЗДЫМКУ: брыгадзір першай брыгады калгаса імя Будзённага, Пухавіцкага раёна, таварыш Канская чытае калгаснікам нумар «Звязды» з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Фото І. Гнедзько (БСФ).

НА РАЁННАЙ НАРАДЗЕ

ЛЕЛЬЧЫЦЫ, 8 жніўня. (**Па тэлеграфу**). 7 жніўня адбылася раённая нарада старшынь калгасаў, брыгадзіраў і загадчыкаў таварных ферм, на якой прысутнічала звыш 200 чалавек.

Удзельнікі нарады з асаблівым уздымам сустрэлі пастанову СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству БССР.

З дакладам на нарадзе выступіў дэлегат усебеларускай нарады старшынь калгасаў старшыня праўлення сельгасарцелі «XV з'езд ВКП(б)» тав. Малчан.

Выступіўшы ў спрэчках старшыня калгаса «Шлях соцыялізма» Сукач заявіў:

— Банда шпіёнаў і дыверсантаў, прадажных сабак фашызма, імкнуліся сваімі гнуснымі дзеяннямі закабаліць беларускі народ, аддаць яго пад ярмо польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Але ворагі пралічыліся. Совецкія чэкісты на чале з лепшым сталінцам тав. Ежовым сваімі ежовымі рукавіцамі па-большэвіцку знішчаюць і будуць знішчаць да канца банду фашысцкіх наймітаў.

Звеннявая калгаса «Чырвоныя ляды» Ляшынская заявіла:

— У адказ на сталінскія клопаты мы запэўняем партыю і ўрад, што не дапусцім ніколі, каб шпіёны і бандыты вялі падрыўную работу і развальвалі нашы калгасы.

Амаль усе выступаючыя спыняліся на неабходнасці яшчэ большага ўмацавання совецкай граніцы.

У сваёй прывітальнай тэлеграме на імя таварышоў Сталіна і Молатава ўдзельнікі нарады заявілі: «Мы ўяўляем сабе, што ў наш пагранічны раён фашысцкія разведкі ў першую чаргу засылаюць шпіёнаў і дыверсантаў. Вось чаму яшчэ і яшчэ раз мы запэўняем вас, таварыш Сталін, што нашы граніцы знаходзяцца на жалезным замку. Ні адна фашысцкая сволач не ступіць нагой на нашу соцыялістычную сямлю. Мы разам са слаўнымі органамі НКВД адрубім фашысцкай гадзіне галаву, каб не пазадна было ёй сунуць сваё свіное рыло ў наш совецкі агарод».

ПАВЫСІМ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

(З рэзалюцыі агульнага схода калгаса «Новы араты»).

— Мы, калгаснікі сельгасарцелі «Новы араты» Сілічаўскага сельсовета, Касцюковіцкага раёна, з вялікай радасцю і ўздымам сустрэлі пастанову СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання.

Гэта пастанова ёсць яшчэ адна велізарнейшая дапамога беларускаму народу, аказаная нашай комуністычнай партыяй, нашым любімым правадыром, родным бацькам таварышом Сталіным. Родны і любімы Сталін па-бацькоўску клапоціцца аб нас, калгасніках, і штодзённа дапамагае ўсяму беларускаму народу.

У адказ на гэту пастанову мы, калгаснікі, абавязваемся яшчэ лепш працаваць, па-гаспадарску ўбраць і зберагчы ўраджай. Уборку мы правядзем высокаякасна, не пакінуўшы на полі ні аднаго коласа. Да 10 жніўня наш калгас поўнасцю выканае абавязковыя пастаўкі збожжа дзяржаве.

Разам з гэтым яшчэ больш павысім рэволюцыйную пільнасць і будзем рашуча выкрываць і знішчаць ворагаў народу, якія імкнуцца нашкодзіць у нашым шчаслівым, заможным калгасным жыцці.

Мы ўсе ад шчырага сэрца дзякуем правадыру народаў таварышу Сталіну за заможнае і радаснае жыццё ў калгасе.

Па даручэнню схода:

АДХІПЦОЎ А., МАЛАШЭНКА М., ГРЫШЧАНКА М., СУКАЛІН К.

АЧЫСЦІМ НАШУ ЗЯМЛЮ АД ШКОДНІКАЎ

СМАЛЯВІЧЫ. 450 старшынь калгасаў, сельсоветаў, брыгадзіраў і загадчыкаў калгасных ферм сабраліся на раённую нараду. Яны дэтальна азнаёміліся з гістарычнай пастановай Соўнаркома Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству БССР і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў калгасным упарадкаванні. Выступаўшыя ўдзельнікі нарады шчыра дзякавалі слаўным чэкістам на чале са сталінскім наркомам тав. Ежовым, якія выкрылі подлых шпіёнаў і шкоднікаў.

Старшыня калгаса «Авангард», член ЦВК БССР тав. Сіманчык Зося гаворыць:

— Шкоднікі, якія пралезлі ў лясныя арганізацыі ў раёне, без усялякай падставы аштрафавалі наш калгас на 6.618 рублёў за парубку лесу, у той час як мы яго зусім не рубілі. Вясной я звярнулася да дырэктара леспрамгаса Чашчына, каб адпусціў нам лесу на рамонт калёс. Чашчын лесу нам не адпусціў, а заявіў: «Раней плаціце штраф, а потым будзем газарыць аб лесе». Так, наш калгас і не змог адрамантаваць калёсы. Цяпер лес перахоўзіць у веданне нашых калгасаў. Мы будзем па-гаспадарску за ім сачыць і вырошчваць новыя лясныя масівы.

Удзельнікі нарады паслалі прывітальнае пісьмо таварышу Сталіну, у якім пішуць: «У адказ на подлую дзейнасць банды шпіёнаў і дыверсантаў мы заяўляем, што аддадзім усе свае сілы, не шкадуючы і свайго жыцця, каб канчаткова ачысціць беларускую зямлю ад усякай погані, ад польскіх шпіёнаў і шкоднікаў». (БЕЛТА).

22 ГЕКТАРЫ ЗА ДЗЕНЬ НА ПАЎДНЁВЫМ КАМБАЙНЕ

КАРМА. Камбайнеркі Бандарэнка Насця і Захарэнка Валя, трактарысты Фамічаў і Цыганкоў, працуючы на палях калгаса «Чырвоны бор», Струкачоўскага сельсовета, на паўднёвым камбайне «Комунар» і на трактары «Сталінец» убіраюць за дзень 22 гектары густога жыта пры норме 8 га.

Надалей камбайнеркі і трактарысты абавязаліся дабіцца яшчэ больш поспехаў.

Іг. КАВАЛЁЎ.

ПОСПЕХ ІЛЬНАЦЕРАБІЛЬШЧЫКА КРЫВАНОСА

Ільнацерабільшчык Заслаўскай МТС тав. Крыванос Адам 7 жніўня ільнацерабілкай «ВНІІЛ-5» выцерабіў 10 гектараў, выканаўшы дзённую норму на 250 проц.

Крыванос Адам ужо выцерабіў 80 гектараў ільну пры сезоннай норме 60 гектараў. Паломак у машыне за ўвесь сезон не было.

ШУПЕНЯ
— нам. дырэктара МТС па палітчасці.

ІЛЬНАЦЕРАБІЛЬШЧЫК РАПУХІН ВЫКАНАЎ СЕЗОННУЮ НОРМУ

Лепшы ільнацерабільшчык Полапкай МТС Рапухін Аляксандр увесь час перавыконвае нормы па церабленню. 1 жніўня ён выканаў сезоннае заданне, выцерабіўшы 60 гектараў ільну, 2 жніўня, працуючы ў калгасе «Новыя Гараны», Шапілаўскага сельсовета, ён выцерабіў за дзень 8 гектараў ільну.

СВОЕЧАСОВА І БЕЗ СТРАТ ЎБЯРЭМ БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ

7 жніўня ў Плешчаніцах адбылася раённая нарада старшынь калгасаў, загадчыкаў ферм і брыгадзіраў, на якой з вялікім уздымам абмяркоўвалі пастанову СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству БССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання.

Старшыня калгаса «Спартак», Узбіцкага сельсовета, тав. Дашкевіч у сваім выступленні адзначыў, што шкодніцтва ў лясной сістэме яшчэ не ліквідавана. Тут лясны вартаўнік ходзіць па вёсках і прадае білеты на права... збіраць грыбы і ягады ў лесе. Калгас «Спартак» ужо другі год плоціць вялікія сумы грошай за землеўпарадкаванне, а колькі зямлі ў калгасе — ніхто не ведае.

Аб шкодніцтве ў асобных калгасах, якое яшчэ не ліквідазана, расказалі: Верасаў — старшыня калгаса «Новы луч», Амнішаўскага сельсовета, Лукашонак Каця з калгаса «Чырвоная зорка», Зарэцкага сельсовета, і інш.

У рэзалюцыі, якая аднадушна прынята удзельнікамі раённай нарады, пішацца: «З пачуццём найвялікшай радасці мы вітаем пастанову партыі і ўрада аб дапамозе працоўнаму сялянству і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва. Мы шчыра дзякуем нашаму Совецкаму ураду, комуністычнай партыі і асабіста таварышу Сталіну і яго саратніку — кіраўніку Совецкай разведкі таварышу Ежову за тое, што дапамаглі выкрыць ворагаў народу і прынялі меры па аказанню дапамогі калгаснаму сялянству ў ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Мы ў адказ на пастанову партыі і ўрада будзем яшчэ больш рашуча змагацца за хутчэйшую ліквідацыю шкодніцтва, выкарчуем да канца астаткі подлай банды польскіх шпіёнаў і дыверсантаў. Мы на справе выканаем лозунг таварыша Сталіна, зробім усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі. Своечасова і без страт убярэм багаты ўраджай, паднімем вагу працадня ў калгасах.

Штодзённа будзем яшчэ больш дапамагаць нашым слаўным пагранічнікам ахоўваць граніцы нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны. А калі наш Совецкі ўрад, комуністычная партыя і таварыш Сталін паклічуць нас стаць на абарону радзімы —мы са зброяй у руках знішчым ворага, разаб'ём яго ўшчэнт».

КУЧЫНСКІ.

ВЫСОКІЯ ЎРАДЖАІ НА ШТУЧНЫХ ЛУГАХ

На асушаных балотах беларускага Палесся ў бягучым годзе атрыман высокі ўраджай траў. На вялікіх плошчах штучных лугоў калгаса імя Беларускай ваеннай акругі, соўгаса «Ведрыч» і іншых калгасаў і соўгасаў, размешчаных у басейнах рэк Ведрыч, Арэса, ураджай першага ўкосу дасягнуў 40—60 цэнтнераў сена на гектар.

Па асушаных балотах калгасаў і соўгасаў Палесся пачалася ўборка ячменю. Мяркуецца сабраць 30 і больш цэнтнераў зярна з гектара.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ ЧЛЕНА ЦК ВКП(б), ЗАГАДЧЫКА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ АДДЗЕЛАМ ЦК ВКП(б) тав. Я. А. ЯКАЎЛЕВА

Аб пастанове Совета Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання.

Прамова тав. ЦЭЛІКАВА Е. І.

(Ордэнаносец, старшыня калгаса «Чырвоны Гай», Рагачоўскага раёна).

Калі мы сутыкаліся з пасеўнымі планамі, узнікалі недаўменні: чаму нам даюць сеяць 50—60 проц. жыта, чаму нам прыходзіцца сеяць жыта па жыту? Асабліва на гэта звярнулі ўвагу калгаснікі-старыкі. Яны ўказвалі нам, старшыням, што мы губім пасевы, што мы ўраджайнасць не падымем. Зараз для нас зразумела, што ўсё гэта рабілася шкоднікамі з мэтай падарваць ураджайнасць соцыялістычных палёў.

У жывёлагадоўлі таксама было многа шкодніцтва.

У нашым Рагачоўскім раёне ёсць многа фактаў, калі ад аднаасобнікаў забіралі зямлю. Сяляне-аднаасобнікі вёскі Сямёнаўкі пачалі захватваць калгасную зямлю. Гэтым самым стваралася азлабленне калгаснікаў супроць аднаасобнікаў і наадварот. Усё гэта было на-руку ворагам народу.

Таварышы, трэба звярнуць увагу на ліквідацыю прышчэпаўскіх і сталыпінскіх хутароў. Дагэтуль па Рагачоўскаму раёну хутары не сцягваюцца. Не адпускаецца на ільготных умовах лес. Цэнтры для сцягвання хутароў яшчэ не паказаны. Калі хто задумае сцягваць свой хутар, то ён не ведае куды знесці хату.

Таварышы, мы павінны заявіць, што калі вораг адважыцца напасці на нашу соцыялістычную радзіму, мы з трактара, з касілкі, са жняяркі перасядзем на танк і будзем біць яго на той тэрыторыі адкуль ён прыдзе. **(Гучныя апладысменты).**

Няхай жыве вялікая Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве наш вялікі, мудры друг таварыш **Сталін!**

(Бурныя апладысменты, усе ўстаюць, крыкі «ўра»).

Прамова тав. УСОВА П. Н.

(Старшыня калгаса імя Калініна, Бярэзінскага раёна)

Старшыня ЦВК СССР таварыш Калінін, будучы ў Беларусі (я не памятаю ў якім гэта годзе), гаварыў, што я, таварышы калгаснікі, ад вас больш нічога не хачу, каб вы далі ў бліжэйшыя гады з гектара 100 пудоў зярна. І сапраўды, гэту задачу пры добрым кіраўніцтве можна з поспехам выканаць.

Працаваў я ў двух калгасах раёна. У калгасе «Чырвоны меч» я выявіў недахват 70 гектараў зямлі. Пачнеш гаварыць работнікам райзямаддзела, а яны адказваюць: а ты як-небудзь. Колькі мы ні пісалі па гэтаму пытанню, але на нашы сігналы не было ніякага рэагавання.

У другім калгасе таксама выявіў, што нехапае 65 гектараў зямлі, згодна плана. Совецкі ўрад хлебапастаўкі дае невялікія. Мы іх зыконваем. Але ўраджай падняць нельга пры шкодніцкім планаванні гаспадаркі. Мы сеялі жыта па жыту, і калгаснікі загадзя гаварылі, што пры такім севазвароце ўраджаю не будзе.

Мы зараз да некаторай ступені вызваліліся ад шкоднікаў. Наш сталінскі кіраўнік НКВД таварыш Ежоў дапамог нам ачысціцца ад гэтай зграі.

Мы павінны зараз працаваць так, каб на працягу аднаго года калгасы нашы сталі непазнавальнымі. Дзякуючы Сталінскай Канстытуцыі нашы калгаснікі сталі энтузіястамі ў рабоце і яшчэ больш адданымі партыі і совецкаму ўраду. Значна павысіліся нормы выпрацовак калгаснікаў. Калі раней рэкордная лічба па касьбе была 0,50 гектара, то сёлета мы скошвалі па 1,6 гектара.

Раней мы баяліся гаварыць, крытыкаваць, таму што на месцах часта заціскалі крытыку, не давалі гаварыць, прышывалі тое, чаго і не думаў.

У нашым калгасе коні былі адны з лепшых у раёне, а шпіёны пашкодзілі так, што 46 коней загінула.

Аднаго разу на свіной ферме ў нас захварэлі свінні. Я выклікаў урача, які прывёз сываратку; прышчапіў яе свінням, і гэтыя свінні на чуму захварэлі. Калгаснікі пачалі гаварыць, што свінням шкодніцка прышчапілі чуму. Так яно і было. Шкоднікі не давалі развівацца нашай ферме. Я думаю, што пасля гэтай нарады мы свіную ферму выцягнем з адстаючых у перадавыя. А гэта важны ўчастак.

Мы павінны да канца выкрыць і знішчыць ворагаў народу і яшчэ з большай энергіяй змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

Няхай жыве наш правадыр вялікі **Сталін! (Апладысменты, усе ўстаюць).**

Прамова тав. КІРПІЧЭНКІ Т. Я.

(Старшыня калгаса імя Молатава, Быхаўскага раёна)

У нас доўгі час шкодзілі найміты польскага фашызма, якія нанеслі калгасам Беларусі вялікія страты.

Мы, калгаснікі, дзякуем нашай партыі і ўраду, што яны выкрылі ворагаў народу, гэту бандыцкую нечысць.

Правільна падышоў ЦК нашай партыі і наш любімы таварыш Сталін, што ў Быхаўскім раёне ліквідавалі два соўгасы. Адзін з гэтых соўгасаў—«Грудзінаўка»— не меў ніякіх даходаў, увесь час жыў на датацыі. У соўгасе ёсць 250 гектараў сенажаці, а ў нашым калгасе толькі якіх-небудзь 60 гектараў. Вельмі цяжка было з кармамі.

У многіх калгасах, якія арганізаваліся ў 1930 і 1932 гг., вельмі вялікая перагрузка ферм. Як вынік — жывёла не забяспечана кармамі, вялікі адыход. Калгаснікі не раз хадайнічалі перад райзямаддзелам, каб іх фермы крыху раскамплектавалі, але гэтага яшчэ не зроблена.

Я яшчэ хачу спыніцца на рабоце Наркомлеса. У гэтым наркамаце ачыстка апарата ад ворагаў, па-мойму, яшчэ не пачата. Я бяру прыклад з вопыту нашага калгаса. Неаднаразова даводзілася хадайнічаць перад Наркомлесам аб лесаматэрыялах і дровах. Але-ж дроў не даюць. Калі-ж і адпускаюць, то не дровы, а суччэ. Тут праводзіцца яўна шкодніцкая работа.

Калі калгасу патрэбна пабудаваць свінарнік на 20 галоў або канюшню на 60 галоў, лясныя органы і райзямаддзел адпускаюць толькі 20 кубаметраў лесаматэрыялаў, і пры гэтым за 40 кіламетраў ад калгаса, хоць лес ёсць радам. Такое планаванне прывяло да зрыву будаўніцтва ферм і тармозіць развіццё жывёлагадоўлі.

Тав. Якаўлеў зусім правільна адзначаў, што ў нас у гэтым годзе багаты ўраджай. Мы яго старанна па-калгаснаму ўбіраем. Ужо выдалі авансы калгаснікам на працадні. Але як змалоць зярно? У Быхаўскім раёне ёсць усяго два млыны, якія зусім разбіты і патрабуюць капітальнага рамонту. Калгаснікам і аднаасобнікам прыходзіцца праседжваць 3—4 дні на млыне. Прычым, памол зярна праводзіцца вельмі дрэнна, атрымліваецца не мука, а нейкая крупчатка. Трэба зрабіць так, каб сяляне не сядзелі па 3—4 дні на млыне, бо гэта адрывае іх ад асноўнай работы ў калгасе.

На гэтым я канчаю.

Няхай жывуць нашы слаўныя совецкія чэкісты на чале з таварышам Ежовым!

Няхай жыве наш любімы правадыр і настаўнік таварыш Сталін, які штодзень клапоціцца аб беларускім народзе, каб мы жылі яшчэ лепш, яшчэ больш заможна.

Няхай жывуць саратнікі таварыша Сталіна таварышы Молатаў і Варашылаў! Ура! **(Усе ўстаюць. Бурныя апладысменты. Воклічы «ура»).**

Прамова тав. АЎЧЫННІКАВА

(Касцюковіцкі раён)

Колькі шкоднікі ні шкодзілі, але калгасныя масы, пад кіраўніцтвам нашага таварыша Сталіна, ламалі і зломяць усе фашысцкія планы, усе іх шкодніцкія махінацыі. У гэтым годзе мы павінны атрымаць не менш 2 кілограмаў зярна і 7—8 кілограмаў бульбы на працадзень. Таварышы, задача кожнага з нас заключаецца ў тым, каб змагацца за ўмацаванне нашага працадня, які ў гэтым годзе шкоднікі ўсякімі спосабамі прабавалі абясцэніць.

Перад намі, старшынямі калгасаў, стаіць задача выявіць і да канца выкарчаваць у сябе ў калгасах шкодніцтва. Нам трэба ва што-б там ні стала даць жорсткі адпор жулікам, лодырам, якія стараюцца раскрадаць калгаснае дабро, абясцэніць наш працадзень. Мы, камандзіры калгасаў, што сабраліся тут, павінны ўзяцца за гэту справу і не дапусціць страты ні аднаго зярняці. Раз'ехаўшыся па калгасах, мы павінны праводзіць агульныя сходы і растлумачыць калгаснікам і калгасніцам дэтальна тую дапамогу, якую мы атрымалі ад ўрада па ініцыятыве нашага правадыра таварыша Сталіна. У гэтым годзе мы павінны сабраць ураджай як ніколі добра.

Няхай жыве наша комуністычная партыя!

Няхай жыве Комінтэрн!

Няхай жыве кіраўнік і правадыр сусветнага пролетарыята таварыш **Сталін!**

(Апладысменты, усе ўстаюць).

Прамова тав. БАГДАНАВА Г.

(Асвейскі раён)

Таварышы, я ўпершыню ў Менску і ў Доме ўрада. Я ўпершыню выступаю на такой вялікай нарадзе.

Шкодніцкая арганізацыя ў Беларускай рэспубліцы нанесла вялікую шкоду беларускаму народу як сялянству, так і рабочаму класу. Я лічу, што за тыя страты, што былі нанесены нашымі калгасамі з-за шкоднікаў, дыверсантаў, мы пабудавалі-б не адзін такі будынак, як гэты, у якім мы зараз знаходзімся.

Наша задача заключаецца ў тым, каб да канца выкрыць і зыявіць усіх шпіёнаў. Для гэтага мы павінны быць пільнымі як ніколі.

Ліквідацыя 138 соўгасаў у БССР дасць магчымасць калгасам павялічыць сваё пагалоўе, бо будуць сенажаці і пасьбішчы. Апрача таго, калгасы будуць мець многа выпасаў у лясах.

Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве таварыш **Сталін!**

(Доўгія апладысменты, усе ўстаюць).

У кулуарах Усебеларускай нарады старшынь калгасаў. НА ЗДЫМКУ (злева направа): тав. Падалец — старшыня калгаса «Моцны барацьбіт», тав. Папкова — старшыня калгаса «Жэрына», Чашніцкага раёна і тав. Лындзіна — старшыня калгаса імя 13 гадавіны Кастрычніка, Дубровенскага раёна.

Фото С. Грына.

Прамова тав. ЛЯХАХОЎСКАЙ

(Старшыня калгаса «Рабочая дружына», Талачынскага раёна)

Мы штодзень бачым вялікія клопаты таварыша Сталіна аб беларускім народзе.

Ворагі беларускага народу ў гэты час усімі мерамі імкнуцца пашкодзіць нам. Па ўказанню шкоднікаў з Наркамзема ў нашых сялян была адабрана зямля і перадана соўгасу «Лемніца». Гэты соўгас ніякага прыбытку не меў, а толькі прыносіў страты. Мы ведаем, што свінаводчая гаспадарка ў «Лемніцы» была заражана чумой. Свінні гінулі. Свінарнікі пабудаваны былі няправільна, давялося ламаць іх і будаваць другія. Як бачым, ворагі адбіралі ад сялян зямлю, а карысці ніякай дзяржаве не было, апрача страт. Правільна пастанавіла наша партыя і ўрад, што гэты соўгас ліквідуюць.

Возьмем другі соўгас — «Усвіжбуг». Ён таксама пабудован на сялянскіх лугах. У сялян нехапала кармоў для жывёлы. Соўгас наймаў да сябе на работу. Калгаснікі кідалі работу і ішлі ў соўгас на сенакос, таму што не было чым карміць сваю карову. Соўгасы гэтыя былі пабудаваны ворагамі народу. Ворагі хацелі разбурыць нашы калгасы. Але ім не ўдалося гэта. Ім, гэтым фашысцкім сабакам, далі па руках і па мордзе.

Але мы не можам быць сёння гарантаванымі, што на месцах няма такіх людзей, якія яшчэ імкнуцца сарваць калгаснае будаўніцтва. Нам яшчэ больш трэба сачыць і выкрываць шкоднікаў.

У нашым раёне не праводзіцца будаўніцтва млыноў. Калгаснік бярэ каня, адрываецца ад работы, едзе на 3—4 дні ў млын, а ён не працуе. А перабоі ў рабоце млыноў арганізаваны са шкодніцкай мэтай, каб азлабіць сялян супроць совецкай улады.

Скажу адносна лясоў мясцовага значэння. Шкоднікі адабралі ад калгасаў лясы мясцовага значэння. У нашым сельсовеце два буйныя жывёлагадоўчыя калгасы, але няма дзе пасвіць стада. Калі запыталі ў райзямаддзеле, дзе пасвіць жывёлу, там адказваюць: «На страсе пасіце кароў». Толькі шкоднік можа так гаварыць.

Ніхто не адзначыў, што робіцца ў бальніцах. Трэба сказаць, што ў нашых бальніцах нямала шкодніцтва. Па нашаму раёну ёсць абураючыя факты. Калі хворы калгаснік прыдзе ў бальніцу, то за ім як трэба не глядзяць. Гэта варожыя адносіны да людзей. У самым Талачыне ў аднаго хлопчыка захварэла маці. Ён пайшоў да доктара паклікаць яго да хворай. Доктар не пайшоў, сказаў, што ў яго выходны дзень. Так што трэба пагледзець на нашых урачоў, каб шкоднікаў не было і ў медыцыне.

Польскія шпіёны поўнасцю яшчэ не выкрыты. Іх трэба карчаваць з коранем і знішчаць, як шалёных сабак.

Ліквідуем іх шкодніцкія справы, каб у калгасах лепш жылося, каб усім калгаснікам стаць заможнымі. **(Апладысменты).**

Прамова тав. ПЛЕСКАЧА

(Старшыня калгаса «Кастрычнік», Дрысенскага раёна)

Мы памятаем гістарычныя словы правадыра народаў таварыша Сталіна, які вучыў і вучыць нас быць пільнымі, умець распазнаваць ворага на кожным кроку, як-бы ён ні маскіраваўся.

Тав. Якаўлеў расказаў нам аб падрыўной шкодніцкай дзейнасці ворагаў, дыверсантаў і шпіёнаў у Беларусі. Ворагі дзейнічалі і ў нашым Дрысенскім раёне. У кіраўніцтва райкома партыі пралез вораг народу. У школах працавалі варожыя элементы.

Наш калгас «Кастрычнік», які знаходзіцца на мяжы з фашысцкай Польшчай, ворагі ўсімі мерамі імкнуліся разваліць. Севазварот у калгасе яшчэ не складзен, прыходзіцца сеяць па дрэнных папярэдніках.

Ворагі народу тварылі свае гнусныя справы і ў будаўніцтве. На нашы просьбы аб водпуску лесу на будаўніцтва ніхто не звяртаў увагі. Калі-ж лес адпускаўся, то толькі за 25 кіламетраў ад калгаса. Гэта справа рук шкоднікаў, былых кулакоў і эксплаататараў, якія за палёна дроў перадавалі ў суд.

Па Дрысенскаму раёну ёсць толькі два млыны і тыя працуюць зусім дрэнна; яны не абсталяваны і не задавальваюць патрэбнасці заможных калгаснікаў. У млынах няма крупадзёрак, няма назат чым малоць зярно. Няўжо гэта не шкодніцкая работа, накіраваная на тое, каб пакінуць калгасы без млыноў? Мы ў гэтай справе не былі дастаткова пільнымі. А наш правадыр і настаўнік таварыш Сталін указвае, што трэба без сораму сігналізаваць, калі заўважаецца дзейнасць ворага.

Вывучаючы Сталінскую Канстытуцыю і даклад таварыша Сталіна, мы, калгаснікі, бачым, што правадыр і настаўнік народаў таварыш Сталін вядзе нас да заможнага, радаснага і шчаслівага жыцця.

Жывучы на граніцы з фашысцкай Польшчай, мы бачым па той бок зусім іншае: голад і смутак. А ў нас, у соцыялістычнай дзяржаве, людзі жывуць заможна і весела, бо партыя Леніна—Сталіна, совецкая ўлада дала рабочым і сялянам нашай краіны заможнае і культурнае жыццё.

Няхай жыве ЦК ВКП(б)!

Няхай жыве вялікі правадыр народаў таварыш **Сталін!**

(Апладысменты, усе ўстаюць).

Прамова тав. ГУРЫНОВІЧ

(Старшыня калгаса «Ленінскі шлях», Бягомльскага раёна)

Шпіёны і дыверсанты хацелі падарваць магутнасць нашай краіны, надзець ярмо на наш беларускі працоўны народ. Але подлым фашысцкім наймітам не ўдалося гэта і не ўдасца ніколі.

Дзякуючы нашаму сталінскаму ЦК ВКП(б), правадыру народаў таварышу Сталіну, дзякуючы слаўнаму НКВД шкоднікі выкрыты і будуць знішчаны.

Мы жывем на граніцы з фашысцкай Польшчай. Кожны дзень мы павінны павышаць большэвіцкую пільнасць, працаваць на нашых соцыялістычных палях з яшчэ большай энергіяй, каб даказаць ненавіснаму загніваючаму капіталізму, наколькі магутная, наколькі моцная наша краіна.

Няхай ведае загніваючая фашысцкая Польшча, што мы ўмеем актыўна працаваць на нашых соцыялістычных палях і таксама актыўна абараняць нашу радзіму. Мы яшчэ больш звяжамся з пагранічнай заставай і будзем дапамагаць совецкім пагранічнікам пільна ахоўваць нашу бацькаўшчыну, каб ні адна нага шпіёна і дыверсанта на соцыялістычную зямлю не ступіла.

Я шчыра дзякую правадыру народаў таварышу Сталіну за шчаслівае, заможнае і культурнае жыццё. Наш родны бацька таварыш Сталін зывеў працоўных жанчын на светлую, радасную дарогу.

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і правадыра народаў таварыша Сталіна мы даб'ем рэшты ворагаў, якія перашкаджаюць нам будаваць светлае жыццё. **(Апладысменты).**

Прамова тав. ЖУРАЎЛЁВА Г. А.

(Старшыня калгаса «Новы свет», Магілёўскага раёна)

На пасадзе старшыні нашага райвыканкома працаваў Плаўнік. Ён ніколі з калгаснікамі і са старшынямі калгасаў па-чалавечаму не абыходзіўся. Плаўнік уяўляў з сябе вялікага вяльможу; ён любіў падхалімства, любіў, каб падхалімы акружалі яго. У нашым Магілёўскім раёне Плаўнік не меў аўтарытэту. Але яго назначаюць намеснікам наркома аховы здароўя БССР. У часе работы яго старшынёю райвыканкома з ім працаваў трацкіст Чудноўскі, якога з райвыканкома выгналі. Чаму-ж, я пытаю, Плаўнік сёння працуе намеснікам наркома аховы здароўя БССР?

Вельмі часта ў калгасы пасылаліся людзі, якія правініліся на вытворчасці, ці яшчэ дзе-небудзь. Прысылалі іх старшынямі калгасаў «для выпраўлення сваіх памылак». Такая пастаноўка была няправільная. Мы павінны пасылаць у калгасы на кіруючую работу лепшых, правераных людзей, а не тых, якія правініліся, якіх як-бы для адбыцця пакарання пасылаюць старшынямі калгасаў.

Некалькі слоў аб зыпасах для жывёлы. Я працую ў Княжацкім сельсовеце, у калгасе «Новы свет». У гэтым калгасе ёсць вялікія лугі. І што вы думаеце? — пасвіць жывёлу нам не дазваляюць на гэтых лугах, і толькі таму, што яны граніцаць з лугамі, што належаць лесгасу.

Я канчаю. Лічу, што наша найлепшая задача быць зараз як ніколі пільнымі. Гэтаму нас вучыць таварыш Сталін.

Няхай жыве комуністычная партыя!

Няхай жыве наш любімы правадыр таварыш **Сталін!**

(Бурныя апладысменты, усе ўстаюць).

Прамова т. ПРЫШЧЭПАВАЙ У. А.

(Намеснік старшыні калгаса «Зара Советаў», Плешчаніцкага раёна)

Таварышы! Мы павінны сказаць поўным голасам, што праклятым ворагам нашай радзімы, якія, як шалёныя сабакі, хочуць укусіць наш Совецкі Саюз, мы сваімі сталёвымі рукамі павыбіваем зубы. **(Апладысменты).**

У Плешчаніцкім раёне лясы мясцовага значэння ад калгаснікаў былі адняты, а жывёлу ўсё-ж трэба было гнаць куды-небудзь пасвіць. У лесе забіралі яе, а калгаснікаў штрафавалі. Ворагі нажываліся за калгасны рахунак. Яны гэты луг у лясах мясцовага значэння касілі, прадавалі і бралі сродкі ў сваю кішэню.

Калгасу «Зара Советаў» патрэбна было дастаць кубаметр лесу для будаўніцтва. Для гэтага патрацілі некалькі дзён і многа сродкаў. Шкоднікі секлі гэты лес, рэзалі яго на такія кавалкі, каб калгаснікі не маглі яго скарыстаць.

Ворагі народу з года ў год даводзілі да нашых калгасаў шкодніцкія планы. У выніку — зрывалася веснавая сяўба. Н... магчыма засеяць 50 гектараў, а яны д...валі 60 гектараў.

Усё гэта работа шкоднікаў, якія па...рываюць магутнасць нашых калгасаў ... ўсяго Совецкага Саюза.

Не гледзячы на гэтыя шкодніцкія дз...янні шпіёнаў, мы ў гэтым годзе сяўб... правялі своечасова, пасняхова ўбіраем ураджай і выконваем пастаўкі. Калгасн...кі і калгасніцы заявілі, што яны яшч... цясней згуртуюцца вакол партыі Леніна—Сталіна і будуць стойка стаяць за спра... соцыялізма. А калі спатрэбіцца, мы з... менім трактар на танк і будзем абараня... сваю радзіму, сваю бацькаўшчыну.

Няхай жыве наш вялікі, дарагі і му...ры бацька таварыш Сталін, які даў на... вясёлае і шчаслівае жыццё. Мы буда... жыць і працвітаць, а праклятых ворага... будзем выкарчоўваць і расстрэльваць.

(Доўгія апладысменты. Усе ўстаюць. Крыкі «ура»).

Прамова тав. АДЗІНЦА І. Ф.

(Старшыня калгаса «Новая зара», Асіпавіцкага раёна).

Я працую старшынёю калгаса сем год. За гэтыя сем год мяняю ўжо шосты калгас. Як можна ўмацаваць калгас, калі мяне так часта перакідаюць з аднаго калгаса ў другі? Зараз я працую ў калгасе, які знаходзіцца пад бокам раёна, на адлегласці 4-х кіламетраў. Тут сядзеў чалавек, які кічыўся сваімі «заслугамі». Гэты чалавек з людзьмі не размаўляў, дзейнічаў самавольна. Ён адштурхнуў чэсных калгаснікаў ад работы. У 1936 годзе ў полі ў яго асыпалася 30 гектараў жыта, 16 гектараў грэчкі, асталося няскошанай 40 гектараў сенажаці, уся салома ў спіртах пагніла, каноплі асталіся неўбранымі. А раённыя работнікі гавораць: нельга яго чапаць, ён вялікі чалавек.

Толькі дзякуючы ЦК ВКП(б) і совецкаму ўраду і любімаму другу калгаснікаў таварышу Сталіну **(апладысменты, усе ўстаюць, крыкі «ўра»)** былі ўскрыты гэтыя шкоднікі. Мы, калгаснікі калгаса «Новая зара», зразумелі, што ёсць людзі, якія клапоцяцца аб нас, ёсць людзі, якія дапамагаюць беларускаму народу, якія вызваляюць беларускі народ ад шпіёнаў, бандытаў, дыверсантаў, засланых польскай разведкай.

Няхай жыве друг народаў, усяго працоўнага чалавецтва таварыш **Сталін!**

(Доўгія апладысменты, усе ўстаюць).

Прамова тав. ДРАЗДОВА

(Старшыня калгаса «17 з'езд ВКП(б)», Добрушскага раёна)

Мы заслухалі даклад члена ЦК ВКП(б) тав. Якаўлева аб справах, якія тварылі польскія шпіёны, дыверсанты ў нас у Беларусі. Я асабіста крануся свайго Добрушскага раёна. Шкоднікі ў галіне ветэрынарыі распаўсюджвалі ў нашым раёне інфекцыйную анемію.

У нашым калгасе ад анеміі пала 4 галавы і было заражана ўсё пагалоўе. Вялікі падзёж коней быў у калгасе «Чырвоны колас». Усё гэта шкодніцтва тварылі дыверсанты, польскія шпіёны — гэтыя сабакі фашысцкай ахранкі, якія прыкрываліся маскай совецкіх урачоў.

Месяц або паўтара таму назад раённы ветурач быў выкрыт як шкоднік і шпіён. Было распараджэнне ўсіх свіней вывезці ў летнія лагеры. Райурач і тут праявіў сваё гнуснае шкодніцтва. Ён выгнаў свіней у тыя месцы, дзе няма вады. Лагеры пабудавалі там, дзе раней былі жывёламагільнікі. Атрымлівалася, што калі ў тых або іншых калгасах за зімовы перыяд адыход быў невялікі, то ў лагерах ён дасягае каласальных размераў.

Прыехаўшы дадому, мы павінны шырока растлумачыць калгаснікам і аднаасобнікам даклад тав. Якаўлева і пастанову СНК Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству БССР. Гэту пастанову трэба шырока распрацаваць на сходах і нарадах калгаснікаў. Мы мабілізуем усіх калгаснікаў на барацьбу за большэвіцкі калгас, за заможнае жыццё калгаснікаў.

Няхай жыве наш мудры бацька таварыш **СТАЛІН!**

(Апладысменты. Усе ўстаюць).

Прамова тав. КОЛАС І. Г.

(Старшыня калгаса «Іскра калектывізацыі», Уздзенскага раёна)

Раней, у пракляты царскі час, у нашай мясцовасці існаваў маёнтак князя Радзівіла. Князь адабраў ад нашага насельніцтва 350 гектараў зямлі.

У 1930 годзе мы на гэтых землях арганізавалі калгас «Іскра калектывізацыі».

Што-ж робяць польскія шпіёны — подлыя фашысцкія найміты? Яны адразаюць ад нашага калгаса 250 гектараў зямлі, перадаюць яе соўгасу «Пагранічнік». Ворагі сціскаюць наша насельніцтва, што няма куды дзявацца. Робяць яны гэта з мэтаю, каб выклікаць незадаволенасць.

Ворагі даводзілі нашаму калгасу вялікія планы па развіццю жывёлагадоўлі. Кармовай базай забяспечыць жывёлу калгас не мае магчымасці. Ад шкодніцкага планавання калгас панёс вялікія страты; цягавая сіла знаходзіцца ў дрэнным становішчы.

Ворагаў народу трэба выкрываць і знішчаць. Я звяртаюся да беларускага народу з заклікам — да канца выкрыць шкоднікаў, усю гэту фашысцкую гніль змесці з твару нашай соцыялістычнай зямлі.

Пастанова партыі і ўрада аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству БССР, аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, аб калгасным упарадкаванні з'яўляецца рашучым ударам па гнусных дзеяннях ворагаў народу.

Мы дзякуем комуністычнай партыі і асабіста таварышу Сталіну за клопаты аб беларускім народзе. Калі мы прыедзем у калгасы, мы растлумачым кожнаму калгасніку аб бацькоўскіх клопатах таварыша Сталіна, які вядзе нас да шчаслівага, раснага жыцця.

Няхай жыве наш родны бацька таварыш Сталін! **(Доўгія апладысменты).**

Прамова тав. ПАЖАРЫЦКАГА

(Старшыня калгаса—Рагачоўскі раён).

У асяроддзе работнікаў нашых совецкіх і нават партыйных органаў пралезлі шкоднікі, дыверсанты, польскія шпікі, якія хацелі прадаць нашу радзіму. Органамі НКВД яны выкрыты, і я думаю, што ні ў аднаго чэснага працоўнага Совецкага Саюза не з'явіцца назат мысль, каб пакінуць гэтых шкоднікаў у жывых. Іх трэба знішчыць як паддлейшых гадаў.

Я хачу сказаць, што і ў нас у Рагачоўскім раёне шкодніцтва таксама мела месца. Былы старшыня райвыканкома Зяленка, камзаг Панамараў і рад іншых не давалі расці гаспадарцы нашага раёна, заціскалі крытыку і самакрытыку. Сакратар райкома КП(б)Б Вайман садзейнічаў ім і таксама заціскаў крытыку. Вайман садзейнічаў таму, што ў раёне накладвалі штраф у 900 руб. за нядачу трох кілограм ільну.

Наша задача заключаецца ў тым, каб мы, раз'ехаўшыся ў свае калгасы, узначалілі справу ператварэння нашых калгасаў у большэвіцкія і жыццё калгаснікаў зрабілі заможным.

Няхай жыве наша комуністычная партыя і яе правадыр таварыш **СТАЛІН!**

(Апладысменты, усе ўстаюць).

ЗВОДКА НАРКАМЗЕМА БССР АБ ХОДЗЕ ЎБОРКІ КАЛАСАВЫХ І ІЛЬНУ

на 5 жніўня 1937 г. (у процантах)

РАЁНЫ І АКРУГІ	Зжата каласавых	Было зжата на 5-VIII 1936 г.	Убрана ў калгасах у сярэднім камбайн на адзін гектар	Абмалочана у працантах да зжатага	Астаецца ў полі зжатага калгасамі нявезеным і незаскірдаваным у копны	Выцераблена калгасамі ільну	У сярэднім на адну ільноцерабілку выцераблена ў калгасах гектар па 1-VIII	Разаслана ільну ў проц. да выцераб. ленага.
Лепельская акруга	72	96	23	11	39	88	16	10
У тым ліку:								
1. Бягомльскі	85	95	33	15	40	78	—	4
2. Лепельскі	68	97	30	12	22	94	24	12
3. Ушацкі	69	98	17	11	50	82	14	5
4. Чашніцкі	67	93	11	7	40	92	10	12
Мозырская акруга	94	99	47	20	6	82	1	13
У тым ліку:								
5. Даманавіцкі	94	100	69	20	8	70	1	12
6. Ельскі	96	100	—	15	9	77	4	16
7. Жыткавіцкі	88	99	—	32	11	78	—	11
8. Капаткевіцкі	91	100	35	19	8	84	1	20
9. Лельчыцкі	97	99	—	17	—	88	—	12
10. Мозырскі	96	100	35	17	3	85	—	11
11. Нараўлянскі	99	98	—	25	4	87	—	26
12. Петрыкаўскі	89	100	—	18	9	87	—	14
13. Тураўскі	97	100	—	19	4	81	—	25
Полацкая акруга	59	91	37	13	54	43	7	1
У тым ліку:								
14. Асвейскі	57	87	43	17	46	52	10	1
15. Ветрынскі	62	96	19	13	37	54	12	2
16. Дрысенскі	57	95	43	11	57	50	8	1
17. Полацкі	61	93	42	7	81	40	—	2
18. Расонскі	59	85	—	18	43	22	2	—
Слуцкая акруга	81	99	62	15	16	89	6	16
У тым ліку:								
19. Грэскі	93	99	41	18	10	99	4	24
20. Копыльскі	81	98	54	14	13	93	10	18
21. Любаньскі	80	97	64	17	13	89	—	5
22. Слуцкі	79	99	52	12	20	67	1	9
23. Старобінскі	83	100	81	14	19	96	2	33
24. Чырвонаслабодскі	80	98	103	16	19	100	8	—
Раёны па-за акругамі								
1. Аршанскі	83	100	41	19	5	98	24	39
2. Асіпавіцкі	75	95	52	12	11	63	1	4
3. Бабруйскі	87	100	59	16	58	60	28	11
4. Багушэўскі	62	96	43	14	67	64	18	1
5. Барысаўскі	80	98	24	13	40	58	2	7
6. Бешанковіцкі	63	98	27	9	36	65	24	12
7. Брагінскі	97	100	78	20	11	92	15	15
8. Будакашалеўскі	79	99	137	20	3	72	40	7
9. Быхаўскі	83	93	40	15	9	63	1	14
10. Бялыніцкі	77	94	82	15	21	92	33	9
11. Бярэзінскі	81	96	23	15	6	80	3	5
12. Веткаўскі	87	98	71	21	17	87	—	2
13. Віцебскі	70	91	18	15	46	72	16	5
14. Гарадоцкі	55	79	18	7	59	29	3	—
15. Глускі	90	90	57	17	10	68	—	8
16. Гомельскі	86	98	80	27	22	81	—	4
17. Горацкі	75	94	27	15	44	91	38	11
18. Добрушскі	83	96	—	12	29	71	46	4
19. Дрыбінскі	82	95	61	17	4	89	—	21
20. Дубровенскі	45	96	4	4	86	46	20	1
21. Жлобінскі	83	96	114	16	7	71	—	11
22. Журавіцкі	84	100	48	21	8	62	20	13
23. Заслаўскі	64	94	91	12	25	77	32	1
24. Камарынскі	92	100	—	24	16	79	—	21
25. Кармянскі	84	100	124	17	9	74	—	23
26. Касцюковіцкі	79	98	89	15	25	70	62	11
27. Кіраўскі	86	91	48	19	4	67	45	28
28. Клімавіцкі	76	94	55	14	34	62	14	10
29. Клічаўскі	75	100	—	17	10	50	—	4
30. Круглянскі	69	87	33	16	29	96	47	9
31. Крупскі	69	93	13	14	19	69	6	10
32. Крычаўскі	80	99	01	16	23	65	23	1
33. Лагойскі	57	95	14	12	17	67	3	10
34. Лёзненскі	46	94	18	8	59	49	9	—
35. Лоеўскі	90	100	—	21	25	77	—	8
36. Магілеўскі	94	100	69	15	13	100	19	21
37. Менскі	69	98	83	14	23	71	—	4
38. Мехаўскі	55	90	—	16	41	29	4	—
39. Мсціслаўскі	81	90	53	19	42	80	12	5
40. Парыцкі	89	100	—	13	2	53	—	6
41. Плешчаніцкі	66	87	21	13	18	37	—	—
42. Прапойскі	90	100	53	21	10	77	18	25
43. Пухавіцкі	72	99	46	12	24	67	7	15
44. Рагачоўскі	82	98	38	17	58	58	14	17
45. Рэчыцкі	91	95	87	15	25	58	—	—
46. Свяцілавіцкі	87	100	48	17	15	68	—	16
47. Сенненскі	61	94	32	11	2	91	27	11
48. Сіроцінскі	56	82	34	7	39	47	5	1
49. Смалявіцкі	64	94	32	9	28	54	23	2
50. Смілавіцкі	73	100	26	9	23	82	24	20
51. Старадарожскі	81	99	62	19	13	73	1	8
52. Суражскі	78	91	25	6	56	29	4	20
53. Талачынскі	73	95	63	14	9	100	8	12
54. Уваравіцкі	83	100	79	18	12	61	—	—
55. Уздзенскі	76	100	50	18	13	68	5	15
56. Халопеніцкі	68	94	55	9	30	64	44	5
57. Хойніцкі	92	100	81	18	10	85	8	20
58. Хоцімскі	75	96	29	8	37	73	7	13
59. Церахоўскі	85	100	100	16	8	90	26	43
60. Чырвонапольскі	82	100	96	31	8	73	20	—
61. Чавускі	84	94	104	13	1	83	20	28
62. Чачэрскі	90	100	102	62	—	65	7	29
63. Чэрвеньскі	72	92	36	9	12	66	—	6
64. Чэрыкаўскі	78	97	113	7	10	53	28	8
65. Шклоўскі	75	95	37	15	23	99	36	30
Па БССР	77	96	54	16	20	69	15	8
Было на 31-VII-37	66	—	41	11	33	52	14	6
Па соўгасах Наркамсоўгасаў на 5-VIII	76	—	50	23	34	—	—	—

УЧОТНА-СТАТЫСТЫЧНЫ АДДЗЕЛ НАРКАМЗЕМА БССР.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ ЧЛЕНА ЦК ВКП(б), ЗАГАДЧЫКА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ АДДЗЕЛАМ ЦК ВКП(б) тав. Я. А. ЯКАЎЛЕВА

Аб пастанове Совета Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання



На ўсебеларускай нарадзе старшынь калгасаў. НА ЗДЫМКУ (злева направа): тав. Касцюковіч М. С., — старшыня калгаса «Ударнік», Талачынскага раёна, Падзеро П. Ф. — старшыня калгаса «Чырвоны край», Старадарожскага раёна, Нарчук П. Б. — старшыня калгаса «Новае жыццё», Талачынскага раёна, і тав. Стэльмах А. Н. — ордэнаносец, старшыня калгаса «Чырвоны ўдарнік», Асіпавіцкага раёна. Фото Лупейка і Прывальскага (БСФ).

Прамова тав. ШЛЯГА

(Полацкі раён)

Таварышы! Мы сёння шчаслівыя тым, што пачулі гістарычную пастанову аб вялікіх ільготах калгаснікам БССР, якая прывезена таварышам Якаўлевым ад таварыша Сталіна.

Таварыш Якаўлеў у сваім дакладзе гаварыў аб тым, што ў нас выкрыта многа ворагаў народу. Толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву нашай ленінска-сталінскай партыі, правільнаму кіраўніцтву СНК Саюза ССР мы выкрылі класавых ворагаў, якія будуць пакараны пралетарскай рукой усіх працоўных Совецкага Саюза.

У нашым Полацкім раёне шкоднікі таксама арганізавалі луггас «Палата» на сялянскіх землях як ворных, так і на сенажацях.

Лясная гаспадарка ў нас у Полацку запушчана. Там яўна дзейнічае рука класавага ворага. Калі пройдзеш па лясах, то ўбачыш цэлыя ярусы няэрэзаных бярвенняў, якія гніюць. У лясах дзяржаўнага і мясцовага значэння раней не дазвалялася і цяпер не дазваляюць пасвіць жывёлу. Пасбішчы леснікамі не скарыстоўваліся, яны надзялялі сябе па 2—3 гектары сенажаці.

У дарожным аддзеле дарожнікам даюць па 2—3 гектары і больш. З'яўляюцца новыя аднаасобнікі тады, калі совецкая ўлада і партыя стараюцца ўмацаваць калгасы. Тут, наадварот, растранжырваюць зямлю другім асобам, займаюцца спекуляцыяй, прадаюць сена і т. д. Таварышы, я лічу, што гэта ненармальна. Я лічу, што ўсё-ж прыдзецца СНК БССР уздзейнічаць на некаторых асоб, якія разбазарваюць социялістычную маемасць.

Тут гаварылі аб шкодніцтве ў сельскай гаспадарцы ў адносінах зернавых культур. У наш Полацкі раён завезлі пшаніцу азімую, якая была зьмешана з жытам, чым тармазілі павышэнне ўраджайнасці.

У нас была стыхійная бяда — град, асабліва ў Юравіцкім сельсовеце, Полацкага раёна. У калгасе «Кастрычнік» былі пабіты градам усе зернавыя культуры. Гэтыя калгаснікі колькі ні падавалі заяў у СНК БССР аб тым, каб знялі з іх зернапастаўкі, ніякага адказу не дабіліся. Гэты калгас быў вымушан купіць зярно і здаць дзяржаве, а калгаснікам нехапіла на размеркаванне па працаднях.

У некаторых нашых калгасах вельмі мала сенажаці, а ім даюць вялікія планы па развіццю жывёлагадоўлі. У рэзультаце — жывёлагадоўчыя фермы не забяспечаны кармамі.

Тут гаварылі аб млынах. У нашым Полацкім раёне таксама было яўнае шкодніцтва. Рад млыноў былі знішчаны. Сёння калгаснікі ездзяць за 40—60 кілометраў малоць збожжа, на некалькі дзён адрываюцца ад работы.

У адносінах планавага будаўніцтва па калгасах. Калгасам планы будаўніцтва даюць, а вось цвікоў, каб весці гэта будаўніцтва, не даюць. Не можа быць, каб на сёнешні дзень наш Савецкі Саюз не меў цвікоў.

Я лічу, таварышы, што ў рабоце МТС таксама ёсць шкодніцтва. Вось вам прыклад. Замест таго, каб трактары ставіць на рамонт восенню, іх ставяць вясной, калі прыходзіцца на іх працаваць.

Толькі калі мы будзем пільнымі, мы зможам выкрыць ворагаў народу, якія прытаіліся яшчэ ў асобных нашых калгасах. Прыехаўшы дамоў, я пастараюся ў нашым калгасе мабілізаваць усе масы на большэвіцкае выкананне ўсіх пастаўленых таварышам Сталіным перад намі задач.

Няхай жыве наша ленінска-сталінская партыя!

Няхай жыве таварыш **Сталін** — наш бацька, які клапоціцца штодзенна аб нашым беларускім народзе!

(Гучныя апладысменты, усе ўстаюць).

Прамова тав. ЛОКСІНА

(Церахаўскі раён)

Польскія шпіёны і дыверсанты шырока разгарнулі шкодніцтва ў соўгасным і калгасным будаўніцтве БССР.

У 1930 годзе ў нас таксама шкоднікамі быў арганізован соўгас на плошчы ў 3.600 гектараў, якая была ўзята ў сялян, у калгаснікаў. Гэту плошчу, пачынаючы з таго-ж года, соўгас не асвоіў, асабліва сенакосныя ўчасткі. У соўгасах прапавалі шкоднікі, як сам дырэктар соўгаса, так і аграном. Самі не скарыстоўвалі сенакосаў і калгаснікам не дазвалялі. Калі ў 1936 годзе калгас імя Леніна выкасіў 60 гектараў сенакосу, падняўся вялікі шум з боку кіраўніцтва соўгаса. На гэты шум прыехаў пехта Татаркін, з конекіраўніцтва Наркамзема БССР. Я лічыў, што гэта асоба аўтарытэтная, пабудзе ў калгасе, пагутарыць з намі і дакладна дагаворыцца. Замест гэтага ён арганізаваў папойку, і на гэтым закончыў сваю «работу».

Шкодніцкая работа, якую праводзілі дыверсанты, была накіравана на тое, каб знішчыць пагалоўе жывёлы соўгаса і калгасаў. Арганізавалі соўгас каля дарогі, а побач зрабілі магілкі для жывёлы. Атрымліваецца, што ворагі не толькі па-шкодніцку арганізавалі соўгас, але зрабілі труну для ўсяго пагалоўя.

Шкоднікі шырока вялі работу па пасеўных плошчах. З 87 гектараў ільну па калгасу імя Леніна толькі 27 пасеяна па канюшынішчу, якое заражана павілікай.

Таварышы, наш калгас імя Леніна, дзякуючы таварышу Сталіну, атрымаў вялікія ільготы. У гэтым годзе мы атрымалі скідку па збожжапастаўках на 271 цэнтнер, супроць мінулага года на 43 проц. нам трэба менш здаваць збожжа.

Наш калгас атрымае ад соўгаса 700 гектараў зямлі, якую ў 1930 годзе забраў ад нас соўгас. Па даручэнню сваіх калгаснікаў я даю гарантыю з'езду, што беручы гэтыя землі, мы іх за адзін-два гады асвоім і дамо ў некалькі раз больш карысці, чым соўгас.

Смерць шкоднікам! Больш пільнасці да вылазак ворагаў, якія хочуць загубіць беларускі народ.

Няхай жыве наш правадыр таварыш Сталін, які даў нам вялікую дапамогу! **(Апладысменты. Усе ўстаюць).**

Прамова тав. ШЫПУЛЯ

(Старшыня калгаса «Чырвоны прымежнік», Лельчыцкага раёна)

У 1928 г. землеўпарадчыкамі была адведзена нам зямля, якою карысталіся раней сяляне, зараз калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны прымежнік». Усяго зямлі было 240 гектараў, з іх 217 гектараў ворнай, астатняе — сенажаць, якую ворагі злачынна адвялі пад лясны фонд. Зараз калгасу даводзіцца карыстацца гэтай зямлёй па дагавору з лясніцтвам. Былі таксама адведзены пасьбішчныя ўгоддзі і сенажаць пад лес мясцовага значэння. У 1935 годзе выдан дзяржаўны акт на вечнае карыстанне зямлёй. Зямля з запаснога фонду нам перадана. Але мы ёю не карыстаемся. Нам не дазваляецца расчышчаць палі, высекаць асобныя дрэвы, каб палепшыць сенажаць.

Калгас «Чырвоны прымежнік» на сёнешні дзень не мае ніводнага гектара папаравага кліну. У нас 261 гектар яравога кліну, 190 гектараў азімага кліну, а ўсяго зямлі, па даных райзямаддзела, 450 гектараў. Прыходзіцца засяваць пяскі і розную нягодную зямлю. Вядома, што гэта зямля не дае патрэбных ураджаяў.

Калі гаварыць аб кіраўніцтве раёна, то трэба адзначыць, што ў Лельчыцы пасылалі розных варожых людзей з асобым заданнем. Цяпер высвятляецца, што на некаторых адказных пасадах у раёне сядзелі ворагі народу. Вядома, што пры такім кіраўніцтве не было каму скардзіцца.

Нашы калгаснікі па пастанове ЦК ВКП(б) і саюзнага ўрада атрымалі ў гэтым годзе вялікую дапамогу па добрабыту, — 26 тысяч рублёў на адну машыну. Вялікая дапамога аказана і зараз па ініцыятыве нашага правадыра таварыша Сталіна.

Калгаснікі ў адказ на клопаты нашай партыі і ўрада яшчэ з большым энтузіязмам узяліся за работу. Знаходзячыся на граніцы, мы дапамагаем нашым слаўным чэкістам абараняць нашу соцыялістычную зямлю ад польскіх шпіёнаў і дыверсантаў. Мы ў любую хвіліну гатовы даць сакрушаючы адпор усім ворагам.

Няхай жыве наша комуністычная партыя!

Няхай жыве таварыш **Сталін** — правадыр і арганізатар нашага соцыялістычнага будаўніцтва! **(Бурныя апладысменты).**

Прамова тав. ЯКУШЭЎСКАГА

(Старшыня калгаса «Полымя», Заслаўскага раёна)

Хачу спыніцца на нашым калгасе, які размешчан на граніцы. На працягу шасці год у калгасе арудавала група шпіёнаў і бандытаў на чале з былым старшынёй калгаса — стаўленікам польскай дэфензівы.

Гэты былы «старшыня» калгаса меў сувязь з шпіёнам, які сядзеў у Наркамземе БССР. Яны прышчаплялі свінням чуму, ад чаго загінула 60 свінаматак.

Шкодніцкая дзейнасць праводзілася ворагамі таксама на падрыў ураджайнасці. Як абстаіць справа з севазваротамі? У нашым калгасе план азімых — 580 гектараў, а папару мала. У мінулым годзе было пасеяна 103 гектары жыта па іржышчу. Зразумела, што пасеянае жыта па іржышчу не можа даць патрэбнага ўраджаю.

Некалькі слоў наконт лясоў. Не так даўно, тыдні тры таму назад, мяне як новага старшыню выклікаюць у арбітражную камісію разабраць пытанне па спагнанню з калгаса 7 тысяч рублёў за лес, які нібы быў вырублен калгасам. Але калгаснікі адмаўляюць факт рубкі лесу.

Зараз уся гэта шкодніцкая дзейнасць групы шпіёнаў у нашых калгасах выкрыта органамі НКВД пры непасрэднай дапамозе нашага любімага правадыра таварыша Сталіна.

Нашы калгаснікі рука ў руку з нашымі слаўнымі чэкістамі выкрываюць і знішчаюць ворагаў. Мы і надалей будзем іх да канца выкарчоўваць і знішчаць. У нас ёсць такія калгаснікі, якія затрымалі па 17 і больш шпіёнаў і дыверсантаў.

Вялікае дзякуй нашаму любімаму таварышу Сталіну, які даў нам заможнае, культурнае жыццё, які вядзе ўсіх працоўных ад перамогі да перамогі.

Няхай жыве наша комуністычная партыя і яе правадыр таварыш **Сталін! (Бурныя апладысменты. Усе ўстаюць).**

ДЗІЎНАЯ „ЗАБЫЎЧЫВАСЦЬ“

Прэзідыум Акадэміі навук да гэтага часу яшчэ не адмяніў зацверджанай у ліпені 1933 года праграмы і інструкцыі па комплекснаму эканамічнаму вывучэнню раёнаў БССР.

Якая гэта была праграма?

Ніхто ў Акадэміі навук не задумаўся над тым, чаму Інстытуту эканомікі для эканамічнага вывучэння раёнаў БССР неабходна высветліць колькасць чырвоных партызан у кожным раёне, сабраць падрабязныя весткі аб партыйнай арганізацыі (сець партыйных ячэек, размяшчэння іх, назвы, колькасці членаў і кандыдатаў партыі, стаж, соцыяльны, нацыянальны і ўзроставы склад), аб комсамольскай арганізацыі, Асоавіяхіме, МОПР'ы ў кожным раёне. Ніхто не задумаўся над тым, чаму Інстытуту эканомікі трэба дакладна ведаць «лік членаў партыі з дарэволюцыйным партстажам і членаў партыі з 1918—1921 года» ў кожнай партарганізацыі, чаму неабходна для інстытута эканомікі «сабраць матэрыялы аб рабоце палітаддзелаў, лепш за ўсё атрымаць іх справаздачы».

Дапытлівы інстытут эканомікі для вывучэння эканомікі Беларусі абавязкова хацеў атрымаць фатаграфіі людзей, маючых заслугі ў барацьбе з белапалякамі і контррэволюцыяй, палітработнікаў, лепшых арганізатараў калгасаў. Адначасова праграма «эканамічнага» вывучэння раёнаў прадугледжвала фатаграфіраваць для Інстытута эканомікі ўсе важнейшыя новабудоўлі, электрастанцыі, прадпрыемствы, іх абстаноўку, масты, дарогі.

Нагласць польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, пралезшых у Акадэмію навук, дайшла да таго, што яны адкрыта патрабавалі ў сваёй інструкцыі «зняць копіі з маючыхся схематычных (калі няма дасканалых) карт сельсоветаў, зняць копіі з планаў леспрамгасаў, сабраць даныя аб шырыні і глыбіні рэк і азёр, характары берагоў і дна, шырыні праездаў у гарадах і т. д.».

Шпіёнская праграма эканамічнага вывучэння раёнаў ставіла сваёй мэтай не толькі сабіраць усемагчымыя весткі для фашысцкіх разведак, але і вербаваць з варожых людзей кадры для шпіёнска-шкодніцкай работы. Для гэтага, напрыклад, дапытлівы Інстытут эканомікі сабіраў весткі аб кулацкіх гаспадарках, асабліва, як указвалася ў інструкцыі, «часоў прышчэпаўшчыны», і асабліва цікавіўся «канкрэтнымі выпадкамі» шкодніцтва і барацьбы класавых ворагаў супроць індустрыялізацыі і калектывізацыі.

Карыстаючыся падтрымкай подлых шпіёнаў і дыверсантаў, якія прабраліся ў ЦК КП(б)Б і Соўнарком БССР, карыстаючыся палітычнай слепатой, ідыёцкай бясклопатнасцю і ратазействам комуністаў Акадэміі, шпіёны дзейнічалі нагла і адкрыта, з вялікім шумам і ў шырокім маштабе разгарнуўшы шпіёнска-разведвальную работу — выдаткавана на гэту справу звыш 300.000 рублёў.

Аб гэтай адкрыта шпіёнскай праграме і інструкцыі ў Акадэміі навук усе даўно «забылі». Гэта «забыўчывасць» з'яўляецца тым больш незразумелай і дзіўнай таму, што гэта праграма і інструкцыя зацвярджалася ў бытнасць віцэ-прэзідэнтам Акадэміі сучаснага кіраўніка Акадэміі навук Сурты, а непасрэдны ўдзел у яе зацвярджэнні прымалі шпіён Домбаль і комуністы Панкевіч і Вальфсон.

Прэзідэнт Акадэміі навук Сурта, які быў тады віцэ-прэзідэнтам Акадэміі, не мог не ведаць аб існаванні гэтай шпіёнскай праграмы «эканамічнага» абследвання раёнаў БССР. Гэта праграма і інструкцыя адкрыта шпіёнскага характару была яшчэ ў жніўні 1933 года аддрукавана ў колькасці 1500 экземпляраў. Пры асабістым удзеле Сурты на прэзідыуме Акадэміі ў 1933 годзе неаднаразова абмяркоўваліся пытанні разгортвання работы па «эканамічнаму» абследванню раёнаў БССР. Члены прэзідыума Акадэміі Панкевіч і Вальфсон не маглі не ведаць аб існаванні шпіёнскай праграмы, якую яны самі разам са шпіёнам Домбалем адобрылі і зацвердзілі. Між тым, прэзідыум Акадэміі навук да таго грунтоўна ўсё гэта «забыў», што палічыў за лепшае аб усім гэтым маўчаць і да гэтага часу нават не ўдасужыўся скасаваць шпіёнскую праграму.

Дзіўная «забыўчывасць»! Дзіўнае маўчанне!

Пад выглядам работы па эканамічнаму вывучэнню раёнаў БССР шпіёны разгарнулі, скарыстоўваючы навуковыя ўстановы, у першую чаргу прэзідыум Акадэміі і Інстытут эканомікі, шпіёнска-разведвальную работу. Характэрна, што сістэматычна ўзнімалася пытанне аб тым, што даныя па раёнах устарэлі, трэба збіраць новыя даныя. Такім шляхам арганізаваная праз Акадэмію навук работа па збіранню ўсемагчымых вестак прадаўжалася і потым, толькі ў зменены, звужаным, больш замаскіраваным выглядзе.

Пасля Домбаля «шэфамі» гэтай «навуковай» работы сталі ворагі народу Маргелаў і Парэчын. Прыклаў да яе руку і мацёры шкоднік, нацыянал-фашыст Пятровіч. Гэтыя ворагі народу былі выкрыты ўжо ў гэтым годзе паміма кіраўніцтва і партыйнай арганізацыі Акадэміі.

Многа шуму было ў Акадэміі вакол работы СОПСА'а (совет развіцця вытворчых сіл), які быў створан Домбалем пры падтрымцы Галадзеда і ўзначальваўся нядаўна выкрытым ворагам Шпенцэрам. Кіраўніком СОПС'а вораг народу Шпенцэр быў зацверджан у канцы 1934 года па прамой прапанове шпіёна Домбаля. Аднак і гэта акалічнасць у рэзультаце дзіўнай «забыўчывасці» комуністаў Панкевіча і Вальфсона, удзельнічаўшых разам з Домбалем на гэтым пасяджанні прэзідыума Акадэміі, была да гэтага часу невядома партыйнай арганізацыі Акадэміі.

Гэты СОПС, зараз ліквідаваны, энергічна збіраў усемагчымыя весткі для «распрацоўкі» пытанняў энергетыкі, воднай гаспадаркі БССР і т. д. Для народнай гаспадаркі Совецкай Беларусі ніякіх рэзультатаў ад гэтых распрацовак СОПС'а звычайна не атрымлівалася, але розныя матэрыялы, атрымліваемыя для «навуковай» работы ў наркаматах і іншых установах, сістэматычна з СОПС'а знікалі.

Неаднаразова аб фактах знікнення дакументаў асобныя работнікі заяўлялі ў прэзідыум Акадэміі і прэзідэнту Акадэміі Сурце. Увагі да гэтых сігналаў не было, канкрэтныя меры да выкрыцця ворагаў, якія займаліся хішчэннем матэрыялаў і дакументаў, не прымаліся. Пасля чарговай алілуйскай балбатні аб пільнасці ўсё асталася па-старому.

Прэзідэнт Акадэміі Сурта прымаў звычайна толькі да ведама факты сістэматычнага выкрыцця пралезшых на адказнейшыя ўчасткі Акадэміі шпіёнаў і шкоднікаў. Прэзідыум Акадэміі звычайна засядаў, а ворагі ў Акадэміі дзейнічалі.

Прэзідыум Акадэміі даўно фактычна самаўхіліўся ад кіраўніцтва інстытутамі. Прэзідыум Акадэміі поўнасцю перадаваў ворагам важнейшыя пытанні і ўчасткі работы. Напрыклад, не гледзячы на пратэсты комуністаў, летам 1936 года прэзідэнт Акадэміі Сурта пакідае на час водпуску дырэктара Інстытута эканомікі кіраўніком інстытута Маргелава, выключанага з партыі яшчэ ў 1933 годзе. Праз непрацяглы час гэты Маргелаў выкрываецца як шпіён.

Лішне даказваць велізарнае палітычнае і народнагаспадарчае значэнне распрацоўкі праблем прамысловасці БССР у трэцяй пяцігодцы. Здавалася-б, што для распрацоўкі пытанняў трэцяй пяцігодкі павінны быць вылучаны лепшыя, палітычна праверапыя, высокакваліфікаваныя кадры. У Акадэміі навук БССР аб гэтым думаюць інакш.

Пытанні развіцця прамысловасці БССР у трэцяй пяцігодцы аддаюцца літаральна на водкуп ворагу Пятровічу. Між тым, прэзідэнт Акадэміі навук Сурта добра ведаў, за што выключан з партыі былы эсэр, нацдэм Пятровіч. Не гледзячы на гэта прэзідэнт Акадэміі Сурта і дырэктар Інстытута эканомікі Ракаў цалкам перадавяраюць маючую важнейшае народнагаспадарчае значэнне работу па трэцяй пяцігодцы ворагу Пятровічу. Вясной 1937 года, пасля выкрыцця Пятровіча, пытанні трэцяй пяцігодкі перадаюцца на водкуп Шпенцэру, потым выкрытаму, як вораг народу. Па рашэнню прэзідыума Акадэміі, які зноў самаўхіліўся ад гэтай работы, Шпенцэр «узначальвае» ўсю работу па трэцяй пяцігодцы. Больш таго, Прэзідыум Акадэміі ў маі 1937 года прапануе Шпенцэру «прапрацаваць старанна ўвесь матэрыял і перадаць для скарыстання ў Дзяржплан БССР».

Пасля шкодніка Пятровіча шкоднік Шпенцэр «прапрацоўвае» усе матэрыялы аб прамысловасці БССР у трэцяй пяцігодцы і перадае іх у Дзяржплан БССР. А ў прэзідыуме Акадэміі нават і цяпер чамусьці не цікавяцца тым, якая шкодніцкая стряпня Пятровіча і Шпенцэра была адпраўлена ў Дзяржплан БССР пад выглядам матэрыялаў Акадэміі навук па трэцяй пяцігодцы.

Заслугоўвае ўвагі партыйнай арганізацыі пытанне, чаму пад носам у дырэктара Інстытута эканомікі комуніста Ракава так беспакарана і бескантрольна працяглы час арудзалі ў Інстытуце эканомікі шпіёны і шкоднікі? Вядома, што Ракаў у мінулым блытаўся з сіяністамі і мае ў сваіх работах грубыя палітычныя памылкі.

Член прэзідыума Акадэміі комуніст Панкевіч ужо пасля выкрыцця Шпенцэра спакойна падпісвае і без усякай праверкі пасылае ў Наркомгас матэрыялы па Полацкай акрузе, распрацаваныя пад кіраўніцтвам ворага Шпенцэра. Праяўляючы палітычную слепату, мяжуючую з пасобніцтвам ворагам, Панкевіч у той-жа час дэмабілізуе партыйную арганізацыю Акадэміі ў справе выкрыцця ворагаў і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва неаднаразовымі заявамі аб нейкіх рашучых дзеяннях у гэтым напрамку прэзідыума Акадэміі. Да рэчы сказаць, гэтыя «рашучыя дзеянні» праводзяцца ў такім кабінетным

(ПРАЦЯГ ГЛ. НА 4 СТАР.).

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У сектары Таледо адбывалася кулямётная перастрэлка. Рэспубліканскія часці нанеслі праціўніку значныя страты.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Мяцежнікі абстралялі рэспубліканскія пазіцыі, размешчаныя каля дарогі з Кабеса дэль Буэй (за 50 клм. на поўнач ад Бельмеса) у Бельмес (за 20 клм. на ўсход ад Фуэнтэ Овехуна).

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Артылерыя мяцежнікаў абстрэльвала Вільсантэ і Берседо (6—8 клм. на ўсход ад Эспінозы).

У астурыйскім сектары рэспубліканскія дынамітчыкі непрыкметна прабраліся ў размяшчэнне мяцежнікаў і ўзарвалі мост праз раку Нарсеа, каля вёскі Корнельяна. Згодна паведамленню агенцтва Гавас, рэспубліканцы, узарваўшы мост, перарэзалі Галісійскую дарогу, і мяцежнікі цяпер вымушаны дастаўляць боепрыпасы і харчаванне сваім часцям абходнымі шляхамі. Рэспубліканцы расставілі ўзброеныя дазоры, якія трымаюць пад агнём сваіх кулямётаў падходы да ракі.

ХВАЛЯВАННІ У ГАРНІЗОНЕ МЯЦЕЖНІКАУ

ПАРЫЖ, 7 жніўня. (БЕЛТА). Як перадае Гавас з Альмерыі, у гарнізоне мяцежнікаў у Мотрылі (на захад ад Альмерыі) зноў успыхнулі хваляванні. Гарматы, устаноўленыя мяцежнікамі на мысе Сакратыф, былі павернуты на Мотрыль. Паведамляюць, што было выпушчана шмат снарадаў. 6 жніўня з Мотрыля даносілася ўзмоцненая перастрэлка.

* * *

ПАРЫЖ, 7 жніўня. (БЕЛТА). Як перадае Гавас з Мадрыда, згодна вестак з толедскага фронта, у епіскапскім палацы і ў саборы Толедо засёлі мараканскія і іспанскія войскі, якія вядуць бой з іншымі часцямі арміі мяцежнікаў. У Толедо прыбылі італьянскія войскі. К вечару 6 жніўня перастрэлка заціхла. Уночы зноў, аж да раніцы 7 жніўня, была чутна страляніна. Над Толедо лятаюць самалёты мяцежнікаў.

Як перадае іспанскае міністэрства абароны, 7 жніўня пачалася сутычка паміж часцямі мяцежнікаў у раёне Толедо ў гарах Мірабель. Па словах міністэрства, іспанскія часці мяцежнікаў паўсталі супроць чужаземцаў.

ЦІКАВЫЯ ПАКАЗАННІ ГЕРМАНСКАГА МАТРОСА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 8 жніўня. (БЕЛТА). Як перадае Гавас з Валенсіі, іспанскае міністэрства абароны паведамляе, што рэспубліканскія ўлады маюць у сваім распараджэнні паказанні аднаго матроса германскага крэйсера «Лейпцыг». Гэтыя паказанні пацвярджаюць, што крэйсер ніколі не падвяргаўся нападу іспанскай падводнай лодкі, як гэта сцвярджаў у чэрвені германскі ўрад. Паказанні германскага матроса, прозвішча якога не называецца па зразумелых прычынах, гавораць, што камандаванне «Лейпцыга» прадпрыняла падрыхтоўчыя крокі, каб сапраўды арганізаваць тарпедыраванне карабля і мець магчымасць затым ускласці за гэта віну на іспанскі ўрад, але затым адмовілася ад гэтай камедыі з-за рыску, з якім гэта справа была звязана, і Германія абмежавалася сцвярджэннем, быццам была прадпрынята спроба тарпедыраваць «Лейпцыг».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

УЗДЫМ АНТЫЯПОНСКАГА РУХУ У КІТАІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 7 жніўня. (БЕЛТА). Японскі друк прыводзіць шмат паведамленняў аб незвычайна быстрым уздыме антыяпонскага руху ва ўсіх раёнах Кітая. Друк указвае, што ў гарадах Паўднёвага Кітая японскія рэзідэнты падвяргаюцца эканамічнаму байкоту і пазбаўлены харчовага забеспячэння, а ў некаторых месцах і комунальных паслуг. Кітайскія рабочыя на японскіх прадпрыемствах у Шанхаі і Цындао ў арганізаваным парадку пакідаюць работу. Як паведамляе Домей Цусін, асацыяцыя ўладароў японскіх тэкстыльных прадпрыемстваў у Кітаі 6 жніўня ўжо прыняла вымушанае рашэнне аб тым, каб у бліжэйшыя дні спыніць вытворчасць на ўсіх прадпрыемствах у Шанхаі. Што датычыць японскага гандлю з Кітаем, то ўсе паведамленні ўказваюць, што японскія тавары ў Цэнтральным і Паўднёвым Кітаі падвяргаюцца вельмі эфектыўнаму гласнаму і нягласнаму байкоту. Кітайскія фірмы адмаўляюцца заключаць новыя здзелкі з японскімі фірмамі і ў масавым парадку растаргаюць старыя, яшчэ не рэалізаваныя здзелкі.

ПРЫГАРАДЫ БЭЙПІНА ПЕРАПОЎНЕНЫ ПАРТЫЗАНСКІМІ АТРАДАМІ

ТОКІО, 7 жніўня. (БЕЛТА). Бэйпінскі карэспандэнт «Ніці ніці» паведамляе, што не толькі сельскія мясцовасці бэйпінскага раёна, але нават прыгарады Бэйпіна «перапоўнены партызанскімі атрадамі з салдат 29-й арміі і паўстаўшага корпуса ахоўных войск ўсходне-хэбэйскага ўрада». Нават у самім Бэйпіне, па словах карэспандэнта, яшчэ налічваецца шмат праціяпонскіх элементаў, якія актыўна прымяняюць метады партызанскай барацьбы.

Спасылаючыся на відавочнікаў, бэйпінскі карэспандэнт Домей Цусін указвае, што часці корпуса ахоўных войск усходне-хэбэйскага ўрада, даведаўшыся аб паўстанні ў Тунчжоу, зараз-жа далучыліся да яго і ў радзе гарадоў Усходняга Хэбэя, у прыватнасці ў Чанпіне яны звергнулі прадстаўніка Інь Жу-гена.

АДКАЗЫ 37 КРАІН НА ЗАЯВУ ХЭЛА

ВАШЫНГТОН (сталіца ЗША), 7 жніўня. (БЕЛТА). Дзяржаўны дэпартамент Злучаных Штатаў Амерыкі апублікаваў адказы 37 краін, у тым ліку і Савецкага Саюза, на заяву Хэла ў друку ад 16 ліпеня.

У гэтых адказах выказваецца агульнае ўхваленне заявы, у якой Хэл заклікаў устрымлівацца ад прыстасавання сілы і прапанаваў вырашаць мірным шляхам міжнародныя праблемы. Друк на відным месцы змяшчае адказ Літвінава, падкрэсліваючы, што СССР жадае міру. «Нью-Ёрк таймс» публікуе поўны тэкст адказу Літвінава на першым месцы сярод адказаў іншых краін.

Адсутнасць адказаў ад Германіі, Японіі і Італіі выклікае неспрыяючыя каментарыі друку, тым больш, што, па словах «Нью-Ёрк таймс», заява Хэла была вытлумачана, як маючая на ўвазе становішча ў Іспаніі і Кітаі. Агенцтва Юнайтэд Прэс указвае, што маўчанне іменна гэтых краін заслугоўвае ўвагі, бо іх «ваяўнічыя дзеянні і дэкларацыі выклікаюць трывогу ва ўсім свеце».

ДА НАЛЁТУ НА СОВЕЦКАЕ ГЕНЕРАЛЬНАЕ КОНСУЛЬСТВА Ў ЦЯНЬЦЗІНЕ

БЭЙПІН, 6 жніўня. (БЕЛТА). Згодна атрыманым карэспандэнтам ТАСС весткам, советніка паўпрэдства СССР у Бэйпіне т. Спільванека, які з'яўляецца адначасова генеральным консулам СССР у Цяньцзіне, наведаў сакратар японскага пасольства Сіма і выказаў жаль з прычыны налёту на совецкае генеральнае консульства ў Цяньцзіне, растлумачыўшы налёт тым, што японскія войскі ў Цяньцзіне ў той момант яшчэ не былі здольны, з прычыны іх малой колькасці, падтрымліваць парадак у тым раёне, у якім знаходзіцца совецкае генеральнае консульства.

Згодна атрыманым з Цяньцзіня весткам, японскі консул у Цяньцзіне паведаміў афіцыяльна старшыню консульскага корпуса ў Цяньцзіне, а таксама віцэ-консула СССР т. Смірнова аб тым, што японскія ваенныя ўлады прымаюць усе неабходныя меры для аховы совецкага генеральнага консульства.

Учора ў Менск прыехала футбольная каманда гераічнага іспанскага народу, верныя сыны краіны Баскаў. Сёння на стадыёне «Дынама» імя Кірава адбудзецца сяброўская футбольная сустрэча са зборнай камандай Менска. НА ЗДЫМКУ: група баскаў-футбалістаў на менскім вакзале. Фото С. Грына.

БАСКСКІЯ ФУТБАЛІСТЫ ПРЫЕХАЛІ Ў МЕНСК

Учора раніцай у Менск прыехала з Масквы футбольная каманда краіны Баскаў — пасланцоў гераічнай Іспаніі.

Да прыходу поезда на пероне выстраіўся ганаровы каравул з студэнтаў Беларускага Ордэнаноснага Дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры. Сустракаць гасцей прышлі прадстаўнікі партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый, фабрык і заводаў, фізкультурнікі.

З'яўленне футбалістаў было сустрэта радаснымі і дружнымі воклічамі ў гонар гераічнага іспанскага народу, у гонар слаўных байцоў і спартсменаў Басконіі. Студэнткі фізкультурнага інстытута прынеслі гасцям букеты кветак.

Пры выхадзе баскскіх футбалістаў на плошчу перад вакзалам сабраўшыеся паладзілі ім авацыі.

У складзе каманды баскаў — 9 байцоў рэспубліканскай Іспаніі. Яны былі адкліканы з фронта і паехалі ў Еўропу дэманстраваць поспехі спорту рэспубліканскай Іспаніі і збіраць сродкі для барацьбы іспанскага народу супроць фашысцкіх мяцежнікаў і інтэрвентаў.

За час прабывання ў СССР баскскія футбалісты з вялікім поспехам правялі сустрэчы ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Тбілісі. Баскскія футбалісты прабудуць у СССР да 15 жніўня, пасля чаго яны выедуць у Нарвегію для сустрэчы са спартсменамі Нарвежскага рабочага саюза.

Прадстаўнік урада краіны Баскаў пры футбольнай камандзе Мануэль дэ ла Сота ў гутарцы з прадстаўнікамі беларускага друку заявіў:

— Роўна два месяцы таму назад баскскія спартсмены па прыездзе ў СССР праязджалі праз сталіцу БССР — Менск, куды мы сёння прыбылі.

Мы заўсёды будзем памятаць Менск. На гэтым вакзале мы ўпершыню атрымалі чуллівыя брацкія прывітанні спартыўнай моладзі СССР, прадстаўляючай мільёны совецкіх грамадзян і адкрыўшай нам дзверы вашай выдатнай радзімы. Першыя словы, якія мы чулі, былі: «Мы любім вас як братоў. Хочам усім сэрцам, каб вы перамаглі, каб вы вызвалілі вашу радзіму ад замежнага іга, каб ваш народ разбіў фашызм».

Ваша радзіма заўсёды застанецца ў нашых сэрцах. Мы будзем заўсёды яе любіць, заўсёды дзякаваць за ўсё тое, што яна зрабіла для нас.

Усюды, куды ні паедзем, мы будзем гаварыць аб вашай выдатнай краіне і нашымі словамі пастараемся знішчыць увесь той яд, які выпускаюць супроць СССР фашысцкія гадзюкі. І заўсёды мы будзем горача жадаць перамогі вашай справы, трыумфа народу, які сямімільнымі крокамі ідзе да перамогі пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна.

* * *

Для тазарыскай сустрэчы са зборнай Менска на зялёнае поле стадыёна «Дынама» імя Кірава 9 жніўня футбольная каманда баскаў выйдзе ў наступным складзе. Вароты баскаў будуць абараняць вратар Грэгорыё Бласко або Экусківа, абарона — Серафін Аэдо і Педро Арэсо, паўабарона — Леонардо Сілаурэн, Хосе Мугерса і Роберто Эчэбарыя. Напад — Эміліо Алоншо, Педро Рэгейро, Ісідро Лангара, Ларынага. Капітанам каманды ў сустрэчы з'яўляецца Гільермо Гарасціца.

Зборная Менска будзе іграць у наступным складзе. Вароты БССР абараняе вратар Леонаў, абарона — Ляскоўскі і Еременка, поўабарона — Львоў, Целях, Аўсеенка, напад — Гусеў, Панфілаў, Румянцаў, Лахонін і Зіноўеў. Капітан зборнай каманды Менска — Гусеў.

М. КІН, І. МІН.

По слядах выступленняў „Звязды“

„ЧАМУ СПЫНІЛІСЯ НА ГЭТЫМ“

Па расследванню матэрыялаў, змешчаных у артыкуле газеты «Звязда» ад 21 ліпеня пад назвай «Чаму спыніліся па гэтым?», у адносінах Каплінскага І. М. партком Акадэміі навук БССР паведамляе наступнае:

Факты, указаныя ў артыкуле адносна работы Каплінскага сумесна з Домбалем, пацвердзіліся. Каплінскі працаваў у Домбаля па тэме «Эканамічнае апісанне раёнаў БССР». Апрача гэтага, пачатае па сігналу «Звязды» расследванне аб сувязях Каплінскага з іншымі ворагамі народу высветліла, што Каплінскі арыштоўваўся органамі НКВД за сувязь з трацкістамі яшчэ ў 1927 г.

Апошні факт Каплінскі скрываў ад парт-арганізацыі. Па справе Каплінскага партком пастанавіў:

За сувязь з трацкістамі і скрыццё гэтага ад партарганізацыі, за прытупленне бальшэвіцкай пільнасці да ворага народу Домбаля, за дапушчэнне трацкісцкіх установак у сваёй навуковай працы, за нешчырасць перад партарганізацыяй Каплінскага І. М. з радоў партыі выключыць.

Агульны сход партарганізацыі зацвердзіў пастанову парткома.

Нам. сакратара парткома Акадэміі навук БССР ІВАНІШЧАНКА.

ШКОДНАЕ РАСПАРАДЖЭННЕ КІРАЎСКАГА РАЙКОМА

4-га жніўня Кіраўскі райком і райвыканкам разаслалі ўсім сельсоветам і калгасам наступнае распараджэнне:

«РК КП(б)Б і РВК прапануе вам увесь наяўны транспарт вашага сельсовета накіраваць на 5 жніўня 1937 г. на возку цэглы і лесу для будаўніцтва райцэнтра нашага раёна. Памятайце, што гэта з'яўляецца ўдарным баявым заданнем і ад таго, як вы выканаеце, будзем меркаваць аб вашай рабоце па ліквідацыі астаткаў шкодніцтва, меўшага месца па нашаму раёну.

Аб выніках далажыце 5 жніўня 1937 года РК КП(б)Б і РВК.

Сакратар РК КП(б)Б Касцюк

Старшыня РВК Лапінскі».

Цяжка сказаць, што гэта распараджэнне з'яўляецца толькі галаваццяпскім. Кіраўніцтву раёна (Касцюку і Лапінскаму) добра вядома, што яны праваліваюць уборкі ўраджаю па раёну. Аб гэтым гавораць лічбы ходу ўборкі. Таму застаецца запытаць у Касцюка і Лапінскага, пасля якіх з'яўляецца іх «загад», па выкананні якога яны збіраюцца меркаваць аб рабоце сельсовета «па ліквідацыі шкодніцтва», ці не льючым ваду на млын шкоднікаў? Па нашаму — з'яўляецца.

Прыкрываючыся разгаворамі аб барацьбе са шкодніцтвам, кіраўнікі раёна самі па сутнасці садзейнічаюць яму.

ЗАГАД, ЯКІ ТРЭБА НЕАДКЛАДНА СКАСАВАЦЬ

Некалькі дзён назад Кіраўніцтва па справах мастацтваў выдала загад, па якому ленінградская беларуская драмстудыя ўліваецца ў дзіцячы тэатр, а ўжо працуючыя ў гэтым тэатры акторы адтуль... «выліваюцца». Толькі так можна зразумець загад Кіраўніцтва.

Па загаду студыя поўнасцю ўліваецца ў дзіцячы тэатр. У студыі лічацца 20—22 акторы, лік-жа актораў тэатра (устаноўлен Кіраўніцтвам у гэтым-жа загадзе) не павінен перавышаць 30 чалавек. Дзіцячы тэатр у яго цяперашнім складзе (г. зн. без студыі) налічвае каля 35 актораў. Значыцца, з гэтага ліку большасць работнікаў падлягаюць неадкладнаму скарачэнню незалежна ад акторскіх здольнасцей, толькі таму, што... не лічацца ў ленінградскай студыі.

Што мела на ўвазе Кіраўніцтва, даючы гэты загад, — невядома, ва ўсякім выпадку нездаровы розум і нежаданне ўмацаваць дзіцячы тэатр. Лепш было-б, каб загад гаварыў аб адборы 30 чалавек у дзіцячы тэатр з лепшых актораў студыі і цяперашняга складу тэатра.

Толькі адсутнасцю сур'ёзнай праверкі калектыва студыі і няведаннем цяперашняга складу дзіцячага тэатра можна вытлумачыць няправільны, шкодны загад Кіраўніцтва.

Загад гэты неабходна неадкладна скасаваць.

А. Г-Н.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Памянёныя ніжэй у спісе выключаныя з партыі выклікаюцца ў горад Менск на Выязную тройку КПК пры ЦК ВКП(б) на 13 жніўня 1937 года: Жураўлёў С. Г., Чарняўскі І. П., Пранузенка П. Е., Бычкова Д. С., Рабцэвіч К. В., Саранчук Ф. Г. (Добруш); Шваронак В. Ф., Шчэрбінскі С. І., Стаянаў Н. А., Казачкоў С. М., Готкіна А. Д., Ліўшыц Р. М., Вайсбурд С. А., Палтаран В. А., Руткоўскі І. У., Булыгін Ф. Т. (Дрыса); Куліш С. А., Кветны І. Р., Удалы Д. Н., Канатоўскі Т. І., Барысенка А. М., Будовіч П. А., Сумара Г. Н., Борэр Д. Н. (Ельск); Ясенеўскі А. В., Вяцер Г. А., Бумагін І. Р., Горычаў В. П., Ігнаценка І. Ю., Ціханаў Н. Н. (Журавічы); Лукоўскі А., Беляўскі Н. В., Гладкоў А. І., Галаўнёва А. Ф. (Крычаў); Якімовіч Ф. С., Маркоўскі І. Я., Рудзь Д. С., Сумешаў С. Я., Савіцкі К. Г., Лашак З. М., (Клічаў); Кныш В. Я., Крупенікава А. І., Друцкі П. В., Садоўскі А. А., Сіваграк Н. І., Альшэўская А. С., Жугер Ф. А., Валасач Л. Л., Каралёў Е. М., Вашук В. М. (Лепель); Раеў В. І., Монід Ф. В., Пчэльнікаў І. П., Ступакоў М. Н., Гісіч В. А., Атеяў Ф. Д., Качук А. М., Слабодскі М. Ш. (Лёзна); Казак М. А., Тужыкаў І. І., Чайкоў П. Л., Радчук С. І., Кукалеў Т. У., Каплан М. Г., (Парычы); Анскайціс В. К., Бекдэрскі Л. І., Вашарымаў Г. К., Бехман М. К., Кавалёў Б. С., Метла І. К., Маневіч Б. Х., Смаляр М. А., Фёдараў Н. Ф., Шаўкуноў П. А., Уліновіч Д. Т., Усава А. Д., Маркава І. Р., Кавалёва В. І., Дабрынін Ф. Д., Гаўрыленка А. С., Мелешка А. Н., Шымкін К. А., Гофман Б. С., Крыўко В. З., Івашчэнка П. М., Жураўлёў Н. А., Кузняцоў В. М., Бяловіч В. Н. (Полацк); Ккін П. Г., Піліпенка М. С., Шурыгіна Біновіч Э. Л., Сенькоў А. І., Дабравол... В. О., Шведаў Г. М., Станкевіч М. Фрэйдлін М. Н. (Прапойск); Эльш... І. А. (П. К.), Алехновіч М. І., Ан... А. А., Пралескоўскі, Матвееў М. В., Г... А. І., Стрэльскі А. М. (Пухавічы); Га... ленка К. А., Дурчын С. Я., Навар Е. Сівуха Л. М., Наўменка А. Л., Астапе... А. Х., Клачко І. І., Кавальчук М. С., ...лавінка Г. Р., Максімаў І. І., Васіл... П. І., Грайвер Н. Е., Кузменка А. М., ...гінскі Б. Н., Новік Н. З., Блінц І. Мяцеліца Ф. А., Валетаў З. В., Бо... П. Д., Герштэйн А. З., Беркеш М. П., ...рыленка П. І., Малікін Э. Г., Кадо... Ц. Я., Чарток А. А. (Рэчыца); Быхаў... Т. І. (Бялынічы).

ДЗЕННІК

Інструкцыйны даклад для прапагандыстаў і агітатараў Менска на тэму «VI з'езд партыі» адбудзецца 10 жніўня, у 7 гадзін вечара, у вялікай зале Дома партактыва. Дакладчык — загадчык аддзелам партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. ГОТФРЫД.

— Семінар кіраўнікоў гурткоў па вывучэнню выбарчага закона СССР сярод працоўных Ленінскага раёна адбудзецца 9 жніўня, у 7 гадзін вечара, у Доме Тэхнікі (Комсамольская, 25).

— Інструкцыйны даклад на тэму «20-годдзе VI з'езда партыі» адбудзецца 10 жніўня, 7 гадз. вечара, у памяшканні Дома Тэхнікі.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ДЗІЎНАЯ „ЗАБЫЎЧЫВАСЦЬ“

(ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК ГЛ. НА 3-й СТАР.).

парадку, што аб іх нават не ведаюць комуністы і работнікі Акадэміі.

Зараз прэзідыум Акадэміі бесперапынна засядае і ў спешным парадку пачкамі знімае з работы работнікаў розных інстытутаў, не даводзячы аб гэтым да ведама калектыва работнікаў Акадэміі. Такім чынам, з Акадэміі ўдаляюцца ворагі, сумніцельныя і непадыходзячыя па дзелавой кваліфікацыі людзі і ў гэтым агульным ліку ворагі атрымліваюць магчымасць уйсці, астаўшыся нявыкрытымі.

Трэба адзначыць, што члены прэзідыума Акадэміі комуністы Панкевіч і Вальфсон, якія на працягу раду год спакойна наглядалі, як насаджаліся ў Акадэміі навук і вялі сваю подлую работу ворагі, і цяпер адмоўчваюцца.

Увесь калектыў работнікаў Акадэміі і да гэтага часу яшчэ не мабілізаван на рашучае выкарчоўванне трацкісцкіх, бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх агентаў япона-германскага і польскага фашызма і на рашучую ліквідацыю вынікаў іх шпіёнска-шкодніцкай работы. Актыў Акадэміі навук, аб неабходнасці склікання якога даўно гавораць комуністы і работнікі Акадэміі, бесперапынна адкладаецца пад усякімі прыстойнымі прычынамі, у тым ліку і пад той прычынай, што супроць гэтага нібы супярэчаць у ЦК КП(б)Б.

Партыйны камітэт Акадэміі навук пачаў прымаць некаторыя меры да выкрыцця людзей, звязаных з ворагамі народу, удзельнічаўшых у шкодніцкай рабоце, да ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, аднак гэта работа абмяжоўваецца да гэтага часу асобнымі інстытутамі. Пара парткому Акадэміі паглядзець глыбей на ўсё, што адбываецца ў Акадэміі. Пара з усіх гэтых фактаў зрабіць большэвіцкія вывады.

Н. СТЭРНІН.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Белдзяржрамтэатра т. 24-905. гастролі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР. 9 і 10 жніўня Н. В. ГОГАЛЬ **РЭВІЗОР** Камедыя ў 5 дзеях.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка» **КЛЯТВА**

Дзіцячы гукавы кінотэатр **РВАНЫЯ БАШМАКІ**

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» **ГАЎРОШ**

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» **ТРЫ ТАВАРЫШЫ**

Гукавы кінотэатр «Спартак» **ШУКАЛЬНІКІ ШЧАСЦЯ**

ДЗЯРЖЦЫРК Парк імя Горкага тэл. 72-725) Гастролі буйнейшага совецкага атракцыёна **ЛЕО-МАРО** Апошнія гастролі ілюзіяністкі **Клео Дароці** з яе 15 асістэнтамі-ліліпутамі. **7—МОРЭНО—7** веласіпедысты-фігурысты. Таксама ўдзельнічае ўся трупа. Пачатак у 9 г. веч. Каса з 12—2 і з 5 г. веч.

РАБФАК ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ ІМЯ В. В. КУЙБЫШЭВА

абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 2-гі і 3-ці курс дзеннага рабфака.
Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 18 да 32 год.
На 2-гі курс з асветай 8 кл., на 3-ці—9 кл. сярэдняй школы.
Паступаючыя трымаюць іспыты па: белмове і літаратуры, рускай мове і літаратуры, палітграмаце, матэматыцы, фізіцы, хіміі, геаграфіі (у аб'ёме 8—9 кл. сярэдняй школы ў адпаведнасці з курсам).
Для паступлення патрэбна прад ставіць наступныя дакументы: заява на імя дырэктара аб дапушчэнні да прыёмовых іспытаў, аўтабіяграфія, даведка аб здароўі, дзве фотакарткі, пасведчанне аб адукацыі, метрыка і паштовых марак на 40 кап.
Пашпарт прад'яўляецца асабіста.
Прыём заяў да 20-га жніўня, іспыты з 20-га па 29-е жніўня.
Заняткі з 1-га верасня.
АДРАС: г. Менск, Універсітэцкі Гарадок, стары корпус.
Залічаныя на рабфак забяспечваюцца стыпендыяй.

ДЫРЭКЦЫЯ.



АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 12

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

14 ліпеня 1937 г. г. Менск.

АБ БАРАЦЬБЕ З СТРАЎНІЧНА-КІШЭЧНЫМІ ЗАХВОРВАННЯМІ.

У мэтах папярэджання страўнічна-кішэчных захворванняў сярод насельніцтва г. Менска, Менскі гарадскі совет **пастанаўляе:**

1. Забараніць:

а) ручны продаж харчовых прадуктаў з зямлі, таксама ў неадведаючых месцах:

б) продаж гнілых, недаспелых фруктаў, ягад і гародніны;

в) водпуск харчовых прадуктаў (нерасфасованых) у незавернутым выглядзе;

г) заварачваць харчовыя прадукты ў макулатуру.

2. Абавязаць загадчыкаў дамамі жактаў, ЖБКТ, камендантаў домаўладанняў, а таксама прыватных домаўладальнікаў:

а) праводзіць рэгулярную ачыстку выграбных ям, прыбіральняў, смеццевых скрынак, не менш аднаго разу ў 10 дзён;

б) штодзенна дэзінфекцыраваць усе прыёмнікі нечыстот, а таксама рыштакі 20 проц. растворам хлорнай вапны;

в) адрамантаваць і трымаць у спраўным становішчы прыбіральні, смеццевыя скрынкі і памыйніцы. Крышкі і дзверцы да іх трымаць зачыненымі, для чаго прыстасаваць пружыны, блокі і інш.

3. Абавязаць прадпрыемствы, установы і прыватных асоб, якія трымаюць жывёлу, утрымліваць гной у шчыльных скрынках з крышкамі і своечасова, не радзей аднаго разу ў шасцідзенку, вывазіць яго.

4. Абавязаць жакты, ЖБКТ, прыватных домаўласнікаў прывесці ў належнае санітарна-тэхнічнае становішча размешчаныя на іх тэрыторыі студні: пачысціць і адрамантаваць зрубы, прыстасаваць крышкі, прывязваць вёдры для агульнага карыстання, зрабіць стокі для вады, таксама спыніць вадапой і сцірку бялізны каля студняў.

5. Абавязаць дырэктароў прадпрыемстваў, камендантаў інтэрнатаў, загадчыкаў сталовых і рэстаранаў забяспечыць рабочых і наведвальнікаў:

а) астуджанай гатаванай, або сельцерскай вадой для піцця;

б) умывальнікамі, ручнікамі і мылам для мыцця рук.

6 Абавязаць кіраўнікоў харчовых прадпрыемстваў (сталовых, рэстаранаў, буфетаў і інш.) забяспечыць захаванне прадуктаў ад мух (набыць шкляныя вітрыны для прадуктаў, калпакі, сеткі на вокнах, занавескі для полак і прылаўкаў), а таксама ўжываць іншыя сродкі барацьбы з мухамі: развешванне ліпкай паперы, скразное праветрыванне, вентылятары ў пакоях і т. д.

7. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы падлягаюць адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб., або прымусовым работам да 14 дзён.

8. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на санітарную інспекцыю г. Менска і РС міліцыю.

9. Гэта пастанова ўваходзіць у сілу з часу яе апублікавання.

Старшыня Менскага гарадскога совета **КУДЗЕЛЬСКІ.**

Сакратар Менскага гарадскога Совета **КАЗЛОЎСКІ.**

Уп. Галоўлітбела № К—3006. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. Б., К., С.